Сербскі хор Вакальнага таварыства „Бранка” з Ніша

Гайнаўскі фестываль ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Вакол Тапалян ☞ 8-9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 21 (2767) Год LIV | Беласток, 24 мая 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Гарадок з роднай песняй — 55

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Ніна Цыванюк: Прайшло ўжо 55 гадоў, нашы дзеці і ўнукі дарослыя ўжо, а нам здаецца — учора ўсё было, як Ніна Мушынская і Жэня Савіцкая гарадоцкі калектыў арганізавалі...

23 мая калектыў беларускай песні „Расспяваны Гарадок” адзначае сваё 55-годдзе з дня заснавання. Варты тоўстай кнігі сам ужо пералік іхніх выступленняў, узнагарод, успамінаў, занатовак пра штодзённую рупную працу, згадак пра дзесяткі шчырых таленавітых беларусаў Гарадоччыны, якія аддалі сваё жыццё роднай песні. Заснавальніцамі ансамбля былі сёстры Ніна Мушынская і Жэня Савіцкая, якая ў той час у Гарадку працавала бібліятэкаркай.

— Папраўдзе наш калектыў пачаў збірацца ў 1953 годзе, — успамінае Ніна Цыванюк, — але мы палічылі, што сапраўдная наша дзейнасць пачалася з 1954 года. Я прыйшла тады ў калектыў, падгадаваўшы сыноў. У той час было мала беларускіх калектываў, пачалі толькі дзейнасць беларускія самадзейны гурткі — у Шчытах, Саколцы, Пяньках.

Маладым калектывам заапекаваліся тады — не існавалі яшчэ меншасныя арганізацыі — Ліга жанчын, Таварыства польска-савецкай дружбы (ТППР). На фестываль моладзі і студэнтаў у Варшаве ў 1956 годзе гарадоцкі ансамбль быў высланы як прадстаўнік Беласточчыны. Выступілі яны ў сцэнічным адзенні такім, як хор Пятніцкага. Беларускія строі фундавала ўжо хору Беларускае грамадска-культурнае таварыства, якое ўзнікла ў 1956 г.

Гарадоцкія мастакі песні спявалі адны, без падтрымкі спецыяліста, да 1967 года. Песні развучалі самі. Дырыжыравала сама Ніна Мушынская, сябра Мікалай Праскураў даваў тон камертонам. У 1967 г. у Гарадок настаўнікам прыйшоў працаваць Сцяпан Копа, без якога немагчыма ўявіць развіццё аматарскіх калектываў на Беласточчыне. Стаў збіраць людзей, вяртаць у гурт таксама і тых, якія па нейкіх прычынах разбрыліся ад калектыву. Расспяваных гарадчан сабралася тады 25 асоб. Сцяпан Копа не пакідаў іх 34 гады! Пасля „Расспяванаму Гарадку” даў падтрымку Віктар Маланчык, які з ім сёння. Вельмі вялікі ўклад у дзейнасць хору мела Ніна Мушынская — арганізатарка, аўтарка тэкстаў, сцэнічных апрацовак, шыла нават касцюмы. Выступалі спачатку ў атласавых, пасля сяброўка з суседніх Меляшкоў наткала ім палатна на сцэнічнае адзенне, пашылі з яго спадніцы і блузкі. Праз калектыў прайшло шмат індывідуальнасцей, мужчын і жанчын. Былі сярод іх удзельнік бітвы пад Монтэ-Касіна Юрка Налівайка, пасля вядомы саліст, настаўнік Мікалай Ваўранюк, Сцяпан Зянюк, Мікалай Лебядзінскі са Страшава, Аляксандр Ясюковіч (цяпер святар і кіраўнік іканапіснай школы ў ЗША), незабыўныя Галена Кот, Раіса Дылько, Вольга Мядзведзева, Надзея Парэмбская, Іра Свентахоўская, Ніна Лапінская, Галіна Паплаўская, Марыя Салагуба. Да сёння выступаюць са старога складу Ніна Цыванюк і Ірына Паўлючук, маладзейшая Тамара Бурачэўская. Спяваюць Аліна Гобец, Ніна Харужая, Галіна Ляховіч, Марыя Врублеўская, Анна Казбярук. Сорак членаў ансамбля адышлі ўжо з гэтага свету.

Ніна Цыванюк, другая пасля Ніны Мушынскай кіраўнічка хору, успамінае першыя канцэрты:

— На выступленні мы ездзілі на трактары, на конным возе. Даводзілася перажыць розныя прыгоды. Калісьці дабіраліся мы дахаты з Міхалова з пастаноўкі „Без віны вінавата” на платформе воза ад хлеба спадара Івана Мойсака, ды лопнула кола. Бывала і цяжка. Замардавалі тады нам харыстку Рэгіну Гутнік, адзіную каталічку ў калектыве. Тады шмат асоб пакінула гурт. Але падмацаваліся мы, пачалі ставіць п’есы — „Мікітаў лапаць”, „Валодзеў гальштук”, „Без віны вінавата”, „Прымакі”, „Паўлінку”, абрадавыя сцэнкі — капанне бульбы, вітанне вясны, бяленне палатна, хрысціны, Каляды, Вялікдзень, Багаты вечар, вечар варожбаў, валачобнікі, абразкі з жыцця беларускай вёскі... Прадстаўлялі мы не толькі сваю гміну ці Беласточчыну, але і ўсю беларускую меншасць у Польшчы. З’ездзілі мы ўсю краіну з канцэртамі. Выступалі з песняй і вянкамі ад нас на польскіх цэнтральных мерапрыемствах. Былі на паказах у Венгажэве, Ломжы, Казімежы над Віслай, Венграве. Выступалі ў агульнапольскіх прэзентацыях культуры нацыянальных меншасцей Польшчы ў Мельніку, Дабрыдзені, Млынарах, Мрангове, на Сувальскім кірмашы фальклору ў Венгажэве (здабылі спецыяльнае вылучэнне за творчы працяг фальклору і яго папулярызацыю), на прэзентацыях народных традыцый і сучаснай народнай творчасці, на агульнапольскім фестывалі „Вясельная бяседа”, „Еўропа без межаў”, у Ломжы. Бяруць прызы на фестывалях беларускай песні ў Беластоку ці як харавы калектыў у катэгорыі аўтэнтычнай і апрацаванай фальклорнай песні ў меншых групах ці сола. Выступалі таксама з індывідуальнымі канцэртамі ў Беларусі — у Пінску, Мінску, Гродне, Мядзеле, Бераставіцы. За дзейнасць у галіне творчасці і распаўсюджвання культуры „Расспяваны Гарадок” адзначаны адзнакай „Заслужаны дзеяч культуры” і залатой адзнакай „Заслужаны для Беласточчыны”. Сябры хору адораны шматлікімі талентамі — дзейнічаюць таксама і ў літаратурным згуртаванні „Каласы”. Хор падтрымала і Гарадоцкая гміна, фундуючы ў дзевяностыя гады строі, сусветна вядомы мастак Лявон Тарасэвіч прафінансаваў хору плакат, буклет, боты, а новыя сцэнічныя строі „Расспяваны Гарадок” атрымаў таксама з Беларусі — ад гродзенскага губернатара.

Аб чым мараць гарадоцкія харысткі, якія свой талент і нават здароўе аддалі роднай справе? Аб тым, каб прыйшлі новыя маладыя сілы. А могуць спадзявацца на папаўненне! Растуць „казачныя” галасы. Жадаем „Расспяванаму Гарадку” яшчэ шмат гадоў плённай дзейнасці, здароўя і радасці!

Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гайнаўка • Высокае • Масты • Беласток • Бельск Падляшскі • Сяматычы

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com

Анджэй Струміла ☞ 4

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Дзень Перамогі ☞ 5

Міра ЛУКША

Разборка ў Старыне ☞ 12

Ева СЦЕПАНЮК

ЗАПРАШАЕ

ПАГАВОРЫМ ПРА...
(ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ АБ-БЫ)

Месца сустрэч: Пачатковая школа нумар 4 Беласток вул. Чэнстахоўска, 6а, а гадз. 18.00
22 ТРАЎНЯ 2009 г.:

Пагаворым пра рэлігію
— сустрэча з
Аннай Радзюкевіч,
журналісткай,рэлігіязнаўцам.

Праект рэалізаваны дзякуючы фінансавай падтрымцы Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства

9 770546 196000

Казка пра рыбакоў і слімакоў

Не вельмі ўважліва сачу я за штогадовымі песеннымі конкурсамі „Еўрабачання", але на гэты раз захацелася засяродзіцца на чарговым фэсце. Праходзіў ён у Маскве, якая не скупіцца ў такіх выпадках і вываліла на арганізацыю і правядзенне эстраднага шоў ажно звыш 40 мільёнаў еўра. Расейцы любяць размах, гэта заўважылі ўсе, у тым ліку і актывісты „Левага фронту", якія палічылі гэта балем падчас чумы і правялі пікет пратэсту.

Конкурс „Еўрабачання" напэўна найбольш дэмакратычны з усіх аналагічных спабораў. Прынамсі на ім няма фактычна аніякіх абмежаванняў — ні ў веку выканаўцаў, ні ў музычным стылі, ні ў выбары мовы, ні ў формах выяўлення песні на сцэне. Стаўленне да „Еўрабачання" ў Старым свеце таксама вельмі рознае — ад поўнага ігнаравання, як у выпадку з ганаровымі італьянцамі, да ўзвядзення звычайнага конкурсу ў ранг найгалоўнейшага ў свеце эстраднага змагання, як гэта любяць ацэньваць на постсавецкай прасторы. Конкурс, які ўсё ж задумваўся для маладых выканаўцаў і стаў трамплінам у музычную эліту для многіх зорак, у апошнія гады, на жаль, ператварыўся у празмерную „салянку", куды прыязджаюць не толькі пачаткоўцы (што значна цікавей!), а і карыфеі поп-музыкі. У вялікіх дзяржавах, якія былі заснавальнікамі „Еўрабачання", хіба і талентаў ужо няма, калі Францыя выпраўляе знакамітую Патрысію Каас, а Вялікабрытанія дасылае акампаніятарам да спявачкі-мулаткі, дарэчы, неблагой вакалісткі, славутага Эндру Лойд-Вебера. Тое ж і немцы, і некаторыя іншыя. Але не ім было наканавана стаць галоўнымі героямі маскоўскага спабору. Ні французскі „антыкварыят", ні нямецкі стрыптыз гледачоў і слухачоў „не зачапілі".

Вынікі конкурсу асабіста мяне прыемна здзівілі. На гэты раз у лік мацнейшых былі выбраны сапраўды лепшыя песні, за рэдкім выняткам. Дзіўна крыху, што высокае месца заняў нумар з Турэччыны — звычайны ўсходні танец жывата, але гэта хіба тлумачыцца надзвычай пашыранай па кантыненце вялізнай турэцкай дыяспарай. Галоўным жа лаўрэатам „Еўрабачання-2009" стаў Аляксандр Рыбак з Нарвегіі, які перамог з вялізным адрывам. Жыў-быў у сталіцы Беларусі ў музычнай сям'і хлопчык па імені Саша. І вось бацькі яго падаліся за мора шукаць лепшай долі ў краіне фіёрдаў і старажытных вікінгаў. А праз многа гадоў вырас хлопец і скарыў сэрцы еўрапейцаў сваёй гарэзлівай і шчырай песняй. Такая вось казка пра Рыбака.

Другое месца заслужана дасталася абаяльнай 19-гадовай спявачцы з Ісландыі з чыстымі вачыма і моцным голасам. Трэцюю пазіцыю па суме балаў нацыянальныя журы і гледачы з розных краін аддалі азербайджанскаму нумару, які захапіў энергічнай кампазіцыяй з выкарыстаннем нацыянальных матываў і прыгажосцю салісткі Айсэль. Слушна спадабаліся многім і эстонскія дзяўчаты з сапраўднай музыкай і абаяльным выкананнем.

Хто яшчэ сапраўды ўразіў — дык гэта гурт з Босніі і Герцагавіны, які не пайшоў шляхам кан'юнктуры і выканаў на сваёй роднай мове надзвычай глыбокую густоўную кампазіцыю. Песня балканцаў была ўспрынята надзвычай высока суседзямі і некаторымі іншымі малымі краінамі. Але тое, што цудоўна зразумелі, прыкладам, чарнагорцы, зусім не ўспрынялі брытанскія і скандынаўскія краіны, якія зусім ігнаравалі выдатнейшы твор. Тым не менш песня патрапіла ў дзесятку, што з'яўляецца вельмі добрым знакам. Цяпер у Еўропе будуць ведаць не толькі баснійскага кінарэжысёра Эміра Кустурыцу, але і гурт „Рэджына".

Што датычыць выканаўца з Беларусі Пятра Ялфімава, то ў фінальную частку, дзе выступалі 25 краін, ён не трапіў. Знаўцы кажуць, што спяваў някепска, але ў цэлым нумар, як кажуць, „не пракаціў", нягледзячы на запрашэнне такога адмыслоўца з Польшчы як Януш Юзэфовіч, ад першасных задумак якога ў выніку амаль нічога не засталося. Беларуская каманда перасварылася паміж сабой. А зараз, паколькі ўсе яны „люди государевы", а грошай было патрачана нямала, заяўляюць пра тое, што нажаляцца адзін на аднаго Аляксандру Рыгоравічу. За ўсе апошнія гады ад Беларусі не было аніводнага нумара з нацыянальнымі матывамі, самабытнасцю. Вось таму найперш, пакуль адны вудзяць рыбу, іншыя толькі поўзаюць нібы слімакі. Народжаны поўзаць — спяваць не можа. А ў цэлым „Еўрабачанне-2009" пакінула надзею, што кантынентальная песенная культура, перш за ўсё за кошт малых краін, пайшла добрым шляхам. Ці стане гэта тэндэнцыяй — пабачым праз год.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Куды ўсё гэта вядзе?

Часам то я ўжо не ведаю, дзе жыву: ці ў нармальнай дзяржаве, ці ў дурдоме. Гэтае апошняе адчуванне, на жаль, з'яўляецца ў мяне штораз часцей. Асабліва, калі гляджу як групы партыйных хітруноў павольна, але паспяхова, даводзяць да падзення дзяржаву, яе эканоміку, суверэнітэт ці абароназдольнасць. Міжвольна складаецца ўражанне, што паўтараецца канец XVIII стагоддзя, што надыходзіць канец польскай дзяржаўнасці. Большасць разбуральных дзеянняў — справа сваіх палітычных элітаў, якія выконваюць вонкавы заказ (вядома, што не бескарысліва), або праяўляюць бязмежную неразумнасць. І каб я памыліўся ў гэтым дыягназе, але мутнай мне бачыцца далейшая будучыня польскай дзяржавы пад такім кіраўніцтвам.

А чаму я штораз горш адчуваю сябе ў сваёй айчыне? А менавіта таму, што менш яе разумею. Вось для прыкладу, кожны новы міністр адукацыі пачынае з адмены рэформ свайго папярэдніка і ўвядзення сваіх ідэй. Дэзарыентаваныя настаўнікі і вучні становяцца ахвярамі чарговых эксперыментаў, а ў краіне як адсутнічаў здаровы сэнс, так і адсутнічае далей. Будова кальцавой дарогі вакол горада пастаўлена ў залежнасць ад пазіцыі Клуба аматараў смаўжоў або ад строга насупленых броваў замежнага бюракрата. Селяніну таксама нельга спакойна планаваць сваю вытворчасць, бо не ведае, што будзе заўтра. У выніку наша краіна стала імпарцёрам цукру і свінога мяса, замест — як калісь — масава пастаўляць гэтыя прадукты на замежныя рынкі. Суднаверфі чэрці ўхапілі, шахты і металургічныя камбінаты — таксама, пэўна неўзабаве і вугаль будзем завозіць з Нямеччыны, бо іхны праўдападобна менш дымяць... Колішнія маральныя аўтарытэты, калі прыгледзецца ім цераз лупу Інстытута нацыянальнай памяці, аказваюцца звычайнымі прадажнікамі і даносчыкамі. Рэпрыватызацыі ні слуху, ні духу. Палітычныя эліты штораз больш заядла спаборнічаюць за прыпадабненне да розных Лепераў ці Палікотаў. Армія ў стане ліквідацыі. Прававая сістэма і правасуддзе як у Оруэла. Чалавек толькі азіраецца адкуль атрымае новы ўдар. А ён што і раз надыходзіць.

Апошнім часам Польская пошта выдала ідыятычнае распараджэнне аб ліквідацыі паштовых скрынак у малых мясцовасцях. У маёй вёсцы таксама знялі гэты складаны і дарагі для ўтрымання прыбор. У выніку, каб выслаць пісьмо, я вымушаны падацца ў горад, дзе яшчэ працуе паштовае аддзяленне, або лавіць пісьманосца, каб перадаць яму свае пасылкі. Калі пачаў я намаганні вярнуць паштовую скрынку Цэнтральны цэнтр пошты Польскай пошты (такая ў яго дзівосная назва) паведаміў мне, што паштовай скрынкай у вёсцы карыстаўся толькі адзін я, а „астатнія вяскоўцы не карысталіся згаданай скрынкай", таму я быў пакараны яе ліквідацыяй. Няважнае, што я месячна высылаю некалькі дзесяткаў пісем і такім чынам з'яўляюся кліентам, які дае пошце акрэслены даход — але скрынку пакінулі ў суседняй вёсцы, хаця ніхто ёю не карыстаецца, але лік насельніцтва ў ёй адпаведны прыдуманай норме. Прытым намесніца дырэктара Цэнтра Ганка Яніцкая ўпэўненая, што „такое вырашэнне не паўплывае на пагаршэнне якасці аказваных Польскай поштай паслуг". Сапраўды, не паўплывае, бо горшых ужо паслуг і быць не можа.

Калі я стаў задумвацца, ці дзяржаўнае прадпрыемства публічнай прыдатнасці Польская пошта трымае на працы ў Цэнтральным цэнтры ідыётаў (першае ўяўленне зусім натуральнае!), дайшоў я да вываду, што ў гэтага распараджэння другое дно. Менавіта ліквідаваныя скрынкі трапяць на скупку металалому і будуць спісаны з інвентару і такім чынам меншай будзе гандлёвая вартасць прадпрыемства. А добрая падрыхтоўка да прыватызацыі на польскі манер, гэта перш за ўсё панізіць вартасць прадаванага прадпрыемства. Здаць скрынкі на металалом, прадаць трохі аўтамашын, звольніць з работы 1700 чалавек, ліквідаваць рэшту вясковых паштовых аддзяленняў — і ўжо цана будзе ніжэйшая, больш даступная. Бо ж ніхто чужы, з-па-за кампаніі, гэтага не купіць, толькі „свой", а свайму ж дагадзіць трэба.

Якой чарговай вынаходкай здзівяць мяне айчынныя геніі — не ведаю. Але цешуся, што я ўжо стары і штораз бліжэй мне да дня, калі назаўсёды закрыю вочы і перастану атручвацца тым, што дзеецца з маёй краінай. Няхай тады нехта іншы стане на маім месцы і перажывае ўсе гэтыя праблемы. Хіба што наступным пакаленням так прамыюць мазгі, што нішто ім замінаць не будзе.

Марк ЦЫБАРТ

Вачыма еўрапейца

Цвёрды арэшак

Былы прэм'ер і мінш. міністр замежных спраў, а цяпер незалежны сенатар Владзімеж Цімашэвіч, кажуць, мае шанцы стаць генеральным сакратаром Рады Еўропы. Была б гэта, здаецца, першая так высока вынесеная на такую высокую еўрапейскую пасаду асоба з Польшчы (прытым звязаная з паўднёва-ўсходняй Беласточчынай), прынамсі ад пяці гадоў, калі Польшча з'яўляецца членам Еўрасаюза. Неафіцыйна мяркуецца, што сярод чатырох кандыдатаў на гэтую пасаду рэальныя шанцы мае яшчэ былы прэм'ер Нарвегіі Торб'ёрн Ягланд. Абедзве рэкамендацыі РЕ (47 краін-членаў) прадставіў Камітэт міністраў на тайным галасаванні (Цімашэвіч атрымаў падтрымку 32 краін, Ягланд — 34). Самае цікавае, што звязанага з левымі асяроддзямі Владзімежа Цімашэвіча афіцыйна запрапанаваў урад Дональда Туска, які атаясамліваецца з ліберальна-правай часткай палітычнай сцэны, не толькі калі гаворка аб польскім парламенце, але таксама і ў Еўрапарламенце.

Сам кандыдат пакуль сціпла выказваецца на тэму магчымага свайго старшынявання Радзе. У адным з інтэрв'ю гаварыў агульна:

— Я лічу, што польскі ўрад слушна палічыў, што ў нас ёсць асаблівае права на здабыццё большага ўплыву на функцыянаванне не толькі заслужанай у мінулым, але ўсё важнай еўрапейскай агранізацыі.

У іншым выказванні заявіў ён, што РЕ патрэбны новы подых. Што гэта б мела значыць для публічнай думкі, пакуль невядома.

Чым з'яўляецца Рада Еўропы? Узнікла яна ў 1949 г. Сярод дзяржаў, якія маюць у ёй статус назіральніка, ёсць Японія, ЗША і Апостальская Сталіца. Ні адна з дзяржаў дасюль не стала членам Еўрасаюза, калі раней не была членам РЕ. І тут, у кантэксце праграмы прынятай у апошні час Еўрасаюзам аб „Усходнім партнёрстве" відаць, якую доўгую дарогу мае перад сабой Беларусь, калі б хацела ўвайсці ў еўрапейскую супольнасць (у арганізацыйна-структурным сэнсе). Яе ўлады падалі заяву на членства ў РЕ ў сакавіку 1993 г. Мела яна нават статус спецыяльнага госця ў яе Парламенцкай асамблеі, але страціла яго пасля пастаўленага пад сумненне еўрапейскімі аранізацыямі канстытуцыйнага рэферэндуму 1996 г. Пасля таго, што адбывалася ў Беларусі ў пазнейшыя гады, не было найменшых шанцаў на г.зв. пазітыўнае абмеркаванне заявы на членства. Прычына таму такая, што асноўнай мэтай РЕ, вызначанай, напрыклад, на яе самітах у Вене ў 1993 г. і пазней у Страсбургу ў 1997 г. і ў Варшаве ў 2005 г., з'яўляецца намаганне на захаванне правоў чалавека, прававую ўладу і дэмакратыю, каштоўнасці рамава акрэсленыя ў яе дакуменце — Еўрапейскай канвенцыі правоў чалавека (1950 г.). У гэтым кантэксце Беларусь чакае шмат работы, пачаўшы ад знясення або хоць увядзення мараторыя на выкананне смяротнага пакарання, не ўспамінаючы ўжо аб паважанні апазіцыі, шанаванні свабоды незалежных медыяў і г.д.

Будучага генеральнага сакратара РЕ, значыць, мабыць, Владзімежа Цімашэвіча, чакае цвёрды арэшак. Шэф МЗС Іспаніі Мігель Ангель Марацінас, гасцюючы ў канцы сакавіка ў Мінску, прадказваў, што калі ягоная краіна будзе ў наступным годзе старшыняваць ЕС і таксама РЕ, Мадрыд „будзе дзейнічаць для збліжэння Беларусі з Радай так, каб гэтая краіна стала раўнапраўным членам гэтай арганізацыі". Прадбачыў, што ў надыходзячы час Беларусь зноў атрымае статус спецыяльнага госця ў Парламенцкай асамблеі Рады. Што на гэта скажа новы генсакратар РЕ? Мабыць, трэба будзе пачакаць да 1 верасня, калі зойме пасаду і заменіць брытанца Тэры Дэйвіса. Ягоны выбар мае адбыцца ў канцы чэрвеня.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Багацце ў разнароднасці

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Гайнаўскі гала-канцэрт завяршылі пераможцы — хор Прыхода Усіх Беларускіх Святых з Гродна (першае месца)

Арганізатары сёлетняга Міжнароднага фестывалю „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі", што з 10 па 16 мая адбыўся ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы, зрабілі акцэнт на багацце царкоўнага спеву і разнароднасць хароў. Маглі выбіраць са звыш шасцідзесяці хароў, якія выявілі ахвоту выступіць на гайнаўскім мерапрыемстве і адабралі для фестывалю каля трыццаці выканаўцаў. Дырэктар фестывалю, мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч яшчэ перад мерапрыемствам заявіў, што ў гэтым годзе будзе больш замежных хароў, чым у мінулых гадах. Найбольш замежных выканаўцаў прыехала з Беларусі і Расіі. Іх лік папоўнілі харысты з Украіны, Латвіі, Грэцыі, Сербіі, Македоніі і Балгарыі. Мітрапаліт варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава, які ў саслужэнні епіскапа гайнаўскага Мірана і епіскапа сямятыцкага Георгія ўзначальваў малітвы ў Свята-Троіцкім саборы перад фестывалем (закрывалася мерапрыемства ў прысутнасці епіскапа беластоцка-гданьскага Іакава) звярнуў увагу, што царкоўны спеў напаўняе нас верай і надзеяй на будучыню ды ўзмацняе часта разбуранае наша духоўнае жыццё.

— „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі" гэта багацце нашай Царквы і за гэта мы дзякуем Богу і ўсім, хто спрыяе іх развіццю, — дадаў мітрапаліт Сава.

— У час вялікіх тэхнічных перамен фестываль з'яўляецца вялікай духовай бяседай, у якой прымаюць удзел людзі з розных куткоў нашай краіны і замежжа. Аднак так склалася, што сёлетні фестываль будзе праходзіць крыху ў ценю жалобы, — заявіў дырэктар фестывалю мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч, бо на другі дзень міжнароднага мерапрыемства адбылося пахаванне маладога іерэя Свята-Троіцкага сабора Тамаша Леўчука, а лаўрэат узнагароды Гран-пры ў час гала-канцэрта выступіў, між іншым, з жалобнай упакойнай малітвай. Сімвалічна фестываль адкрыў бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк, а распачаўся ён з канцэрта хору Ваяводскай камендатуры паліцыі ў Беластоку, які ў мінулым годзе заняў першае месца ў катэгорыі іншых хароў. Апрача пастаянных наведвальнікаў фестывалю, гайнавян, прыбыло на яго, асабліва ў час адкыцця і гала-канцэрта, многа знатных гасцей: прадстаўнікі ўрада з міністрам навукі і вышэйшага школьніцтва прафесар Барбарай Кудрыцкай, парламентарыі, дыпламаты, самаўрадаўцы, прадстаўнікі шматлікіх устаноў і святары з розных краін.

Пачатак быў сумны

Першы дзень конкурсных праслухоўванняў (12 мая) распачаўся з выступу кафедральнага хору Свята-Троіцкага сабора. Цяжка было ім інаўгураваць праслухоўванні, бо некалькі гадзін раней закончылася пахаванне а. Тамаша Леўчука (1971 год нараджэння), а ў час літургіі і пасля яе спяваў той самы кафедральны хор. Хаця змучаныя харысты моцна перажывалі страту іерэя, выступілі ўдала і занялі высокае трэцяе месца ў ліку парафіяльных выканаўцаў, беручы пад увагу, што ў гэтай катэгорыі перамаглі хары, у якіх спявалі прафесіяналы з музычнай адукацыяй. У час перапынкаў, якія ладзяцца паміж конкурснымі выступленнямі, гайнавяне таксама ўспаміналі трагічнае дарожнае здарэнне, якое адбылося 2 мая на дарозе Бельск-Падляшскі — Гайнаўка. Мяркуецца, што з-за пастаўленага на скрыжаванні дарог унітаза іерэй страціў панаванне над машынай, якая ўдарыла ў дрэва. Святар страціў прытомнасць і памёр пасля тыдня змагання за жыццё. Пакінуў матушку і двое дзетак, 6-гадовую Анну і 3-гадовага Аляксандра. Святую літургію ў час пахавання ўзначальвалі епіскап гайнаўскі Міран і епіскап горліцкі Паісій (бацька якога родам з падгайнаўскага Новага Корніна). Развітацца з іерэем Тамашом Леўчуком прыбылі дзесяткі святароў, мноства прыхаджан. Епіскап Міран звярнуў увагу, што айцец Тамаш быў прыкладным святаром, а раней дыяканам, які з сэрцам нёс дапамогу патрабуючым. Людзі хвалілі свайго святара за сціпласць і зычлівасць да вернікаў.

Віртуознасць і высокі ўзровень выканаўцаў

У час сёлетняга фестывалю побач традыцыйнага царкоўнага спеву прэзентаваліся складаныя творы розных кампазітараў. Спецыялістам па царкоўнай музыцы зразумела, што некаторыя сучасныя царкоўныя песні, з якімі перамагаюць хары, не падыходзяць да пастаяннага спявання ў час багаслужбаў (хіба, што ў час вялікіх святаў), бо вернікам, якія звярталі б увагу на віртуознасць, цяжка было б засяроджвацца на малітве. Аднак прэзентацыя ў час фестывалю такіх складаных кампазіцый дазваляе паказаць умеласці і высокі ўзровень спеву паасобных хароў і павышае мастацкі ўзровень самога фестывалю, што з'яўляецца адной з мэт яго арганізатараў. Адно трэба памятаць, каб трымацца царкоўных канонаў, за чым назірала конкурсная камісія.

Вялікую віртуознасць і царкоўны спеў на вельмі высокім мастацкім узроўні паказаў лаўрэат узнагароды Гран-пры, сербскі хор Вакальнага таварыства „Бранка" з Ніша. Хаця выступаў ён як прыхадскі хор, можна было дадумвацца, што спявае ў ім многа прафесіяналаў. Першага месца дабіўся таксама іншы сербскі хор у катэгорыі іншых хароў Дзіцячы хор „Бранка", таксама з Ніша, што вельмі захапіў гайнаўскую публіку сваім дзіцячым, але ўмелым спевам. Іншымі пераможцамі фестывалю сталі беларускія хары. У час гала-канцэрта побач сербскіх харыстаў мерапрыемства закрыў хор Прыхода Усіх Беларускіх Святых з Гродна, што сумеў спалучыць малітоўнасць з вельмі высокім мастацкім узроўнем царкоўнага спеву. Заняў ён першае месца сярод парафіяльных выканаўцаў, а гродзенскі дырыжор Наталля Гаплічнік не скрывала, што ў яе прыхадскім хоры большасць спевакоў складаюць прафесіянальныя музыкі, выпускнікі Мінскай кансерваторыі, выкладчыкі музычных школ. Аднак ёсць там і аматары, прадстаўнікі немузычных прафесій. Першае месца з ліку акадэмічных хароў было прысвоена Маладзёжнаму хору „Brevis" Мінскай мастацкай дзяржаўнай калегіі за асаблівыя музычныя ўмеласці. Другое месца сярод акадэмічных выканаўцаў прыпала таксама беларусам — Мужчынскаму вакальнаму калектыву „Благавест" з Мінска, які нядаўна быў створаны пры Беларускім экзархаце Маскоўскай патрыярхіі ў Мінску (яго харысты, гэта ў асноўным псаломшчыкі розных мінскіх прыходаў) і для польскага хору Вышэйшай школы грамадскай псіхалогіі з Варшавы. Абодва выканаўцы паказалі добрыя тэхнічныя ўмеласці, хаця іх спеў заўважальна розніўся. Чацвёрты выканаўца з Беларусі, Камерны хор Пружанскага палаца культуры, які таксама выступаў як акадэмічны хор, атрымаў спецыяльную ўзнагароду (нельга блытаць з вылучэннем). На высокі мастацкі ўзровень у час прэзентацыі складанага рэпертуару запрацавалі ў вялікай ступені выкладчыкі Пружанскай дзіцячай школы мастацтва, якія састаўляюць вялікую частку харыстаў.

Вельмі добра, што на фестывалі ў розных катэгорыях выступаюць хары з Беласточчыны, на якія асаблівую ўвагу звяртаюць не толькі гайнавяне. У катэгорыі іншых хароў першага дня праслухоўванняў выступілі сёстры з Макаўкі, дырыжорам якіх была журналістка Радыё Беласток, матушка Анна Пятроўская. Іх далікатныя галасы спадабаліся публіцы, але матушка, якая разам з сёстрамі спявае ў галоўным народную музыку, не скрывала, што магло б быць лепш, калі б рэпетыцыі праводзіліся ў царкве, а не ў закрытым памяшканні. Цікавую музыку і на высокім узроўні запрэзентаваў Камерны мужчынскі хор Супрасльскага манастыра, якім кіруе выхадзец з Гайнаўкі, візантыйскі музыколаг Марцін Абійскі, выпускнік Нацыянальнай афінскай кансерваторыі і Афінскага ўніверсітэта. Супрасльскі хор стараецца адрадзіць літургічны манастырскі спеў з XVI стагоддзя і таму выступіў з царкоўнымі творамі з „Супрасльскага ірмалагіёна" ды заняў трэцяе месца ў катэгорыі іншых хароў. Свае ўмеласці паказалі таксама ў катэгорыі іншых хароў „Audite Verbum" з Заблудава і „Рамонка" з Ласінкі, які атрымаў вылучэнне, ды Маладзёжны хор Дзмітрыеўскага прыхода з Гайнаўкі. Вылучэнне атрымаў таксама хор працаўнікоў і студэнтаў Політэхнічнага інстытута ў Беластоку „Поліфанія".

Сёлета арганізатары фестывалю, якімі з'яўляюцца Грамадскі арганізацыйны камітэт і аб'яднанне „Любіцелі царкоўнай музыкі", паменшалі колькасць катэгорый, у якіх харысты змагаліся за перамогу, але рашыліся ўзнагародзіць больш хароў у паасобных катэгорыях. Апрача згаданых хароў у катэгорыі прыхадскіх выканаўцаў другое месца заняў Маладзёжны хор „Надія" з Крыніцы (Польшча), а сярод акадэмічных выканаўцаў трэцяе месца заняў камерны хор Калінінградскага сабора (Расія — усе выканаўцы з музычнай адукацыяй). З ліку іншых хароў трэцяе месца заняў Вакальны калектыў „Рэчанька" з Вялікага Ноўгарада (Расія), другое месца — Маладзёжны камерны хор „Accolada" з Рыгі (Латвія), а спецыяльную ўзнагароду атрымаў Візантыйскі хор традыцыйнай музыкі Гарадскога інстытута культуры Пеанскага раёна (Грэцыя). Першы гала-канцэрт адбыўся 16 мая ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы, а праз некалькі гадзін другі прайшоў у царкве Агія Софія ў Беластоку і такім чынам завяршыў мерапрыемства царкоўнай музыкі.

Выступілі з дадатковымі прапановамі

Ужо здаўна ў час гайнаўскага фестывалю арганізаваліся дадатковыя мерапрыемствы і так было ў гэтым годзе. Канцэрты царкоўнай музыкі былі наладжаны ў Варшаве, Бельску-Падляшскім, Гарадку, Дубінах, Заблудаве. З народнымі песнямі выступілі хары побач Асяродка лясной адукацыі „Ягелонскае", распаложанага непадалёк ад Белавежы. У Гайнаўскім доме культуры была наладжана выстаўка „Слядамі праваслаўя ў паўднёвай Італіі", а ў ніжняй царкве гайнаўскага сабора была паказана выстаўка „Праваслаўе ў Польшчы". У час фестывалю прадстаўнікі капітула ўзнагароды імя князя Канстанціна Астрожскага ўзнагародзілі сёлетніх лаўрэатаў.

Валун — загадка

Гэты загадкавы валун знаходзіцца ў паўночна-ўсходняй частцы Палацавага парку ў Белавежы, непадалёку шпацырнай дарожкі. Яго акружнасць — каля 6 метраў. Загадкавасць валуна скрываецца ў надпісе на ім. Менавіта аўтары даваенных турыстычных даведнікаў (м.інш. Віктар Шыманскі, Ян Ежы Карпінскі, Ян Клёска) падавалі, што на ім вырыты надпіс „1747 год", а прынамсі столькі можна было ў той перыяд расчытаць. Сёння ўжо на ім нічога няма, час сцёр і гэты скромны след. На валуне асталіся толькі сляды па спробе раскалоць яго на часткі. Адну частку некаму ўдалося ўсё-такі адкалоць. Гэтыя спробы праўдападобна вяліся ў перыяд будовы царскага палаца, значыць у 1899-1894 гадах.

Якое здарэнне мог увекавечваць валун і хто зрабіў надпіс? Па сённяшні дзень гэта застаецца таямніцай. У 1747 годзе ў Белавежы і Белавежскай пушчы нічога асаблівага не здарылася, а прынамсі нічога на гэтую тэму не даносяць пісьмовыя крыніцы. Значыць, надпіс бадай не ўвекавечваў нейкага важнага здарэння, а найхутчэй факт мясцовага або і нават прыватнага значэння. Пасля такога доўгага часу хіба ўжо нічога аб гэтым не даведаемся. У сямідзесятых гадах мінулага стагоддзя я прабаваў распытваць пра валун мясцовых старажылаў, але ніхто з іх нічога канкрэтнага не мог мне сказаць. Нехта толькі ўспомніў, што непадалёку валуна знаходзілася магіла з драўляным крыжам, але яна паявілася тут падчас II сусветнай вайны.


Фота Малгажаты КАРЧЭЎСКАЙ

Валун захоўваецца як помнік прыроды. Побач алеі пастаўлена інфармацыйная дошка. Калі будзеце ў Белавежы, наведайце гэтае месца.

Пётр БАЙКО

Гайнаўская дэмаграфія

Паўвека таму ў Гайнаўцы жыло 12 260 чалавек, у 1965 годзе — 13 500, у 1992 годзе — 24 600 асоб. Для параўнання: у 1945 годзе Гайнаўка налічвала каля 7 тысяч насельніцтва.

У 2008 годзе ў Гайнаўцы пражывала 22 795 асоб, а год раней — у 2007 г. — 22 991. У 2008 годзе пажаніліся 204 пары і нарадзілася 329 дзяцей (169 дзяўчынак і 160 хлопчыкаў). Найбольш папулярнымі імёнамі, якія бацькі давалі нованароджаным, былі Юлія, Вікторыя, Габрыела, Анна і Магдаліна ды Кацпэр, Барташ, Якуб, Каміль і Матэвуш.

Зараз у Гайнаўцы сямёра стогадовых старажылаў, у тым ліку шэсць з іх — жанчыны.

У 2008 годзе памерлі тут 432 асобы, а ў 2007 годзе — паўтысячы.

(яц)

Ублытаны ў тры культуры

Размова з прафесарам Анджэем Струмілам, сусветна прызнаным мастаком, пражываючым у Мацьковай Рудзе на Сувальшчыне, родам з Вялікага Княства Літоўскага, стваральнікам канцэпцыі выдадзенай нядаўна „Кнігі Вялікага Княства Літоўскага"

„Ніва": — *Чым для Вас з'яўляецца Беларусь?*

Анджэй Струміла: — Гэта мне вельмі блізкі абшар, напэўна бліжэйшы чым Сілезія, Памор'е ці Пазнаншчына.

— ***Вы вучыліся ў беларускай гімназіі ў Навагрудку. Якія ў Вас успаміны з гэтага горада?***

— Гэта горад, а хутчэй мястэчка, у якім я правёў „пару" гадоў. Хадзіў я там найперш у беларускі педагагічны ліцэй, які ў час нямецкай акупацыі быў там адзінай функцыянуючай сярэдняй школай. Я хацеў працягваць адукацыю, якую пачаў яшчэ да вайны. Школа была настаўлена выключна на беларускую мову. Самае цікавае, што немцы ў Остландзе, значыць, у акупаванай краіне, не давалі дазволу на польскае школьніцтва, а падтрымлівалі беларускае, прынамсі на падставовым узроўні. Вучыўся я там бадай год, бо пасля мяне адтуль выкінулі як чалавека, які адкрыта дэкларавў польскую нацыянальнасць. Гэты ліцэй быў толькі для беларусаў.

— ***Ці гэта якраз тады і якраз у Навагрудку навучыліся Вы беларускай мовы, якой, што маглі мы пачуць у час прамоцыі „Кнігі", дасканала валодаеце?***

— Я проста мусіў гэтай мовы навучыцца. Калі савецкія войскі прыйшлі ў Ліду ў 1939 г., а ў той час я якраз там жыў, адразу і тут мовай выкладання ў школе стала беларуская. Большасць з нас не ведала беларускай мовы, але мусілі яе вывучыць. Пражываючы там, на гэтак званых крэсах (гэтае акрэсленне сёння ўжо акампраметавалася!) сутыкаўся я таксама з вясковай моладдзю, якая карысталася беларускай мовай час ад часу, але тады яшчэ, да гімназічнага часу, я сам яе не ведаў.

— ***Каторы з геаграфічна-гістарычных абшараў Вам бліжэйшы: польскі, літоўскі, а можа беларускі?***

— Не хачу гэтага расцэньваць. Гэта незвычайна цяжкае. Не ўмею адназначна сёння на гэтае пытанне адказаць. У культурным сэнсе, гледзячы на маё выхаванне ў дзяцінстве, прывязанасць маіх бацькоў, у якіх ужо не магу пра гэта спытацца, дэкларую сёння польскую нацыянальнасць. Напэўна моцна я ўблытаны ў польскую культуру. Не з'яўляюцца мне, аднак, чужымі ані культура літоўская, ані беларуская. Не з'яўляецца для мяне чужой гісторыя гэтых народаў, а іхні лёс вельмі мяне займае. Адчуваю з імі нейкую супольнасць, эмацыйную лучнасць з народамі як Беларусі, так і Літвы. Я жадаў бы сабе як найбольш гарманічнага супрацоўніцтва гэтых трох народаў так, як я стараўся ўчыніць гэта шляхам „Кнігі". Пры нагодзе скажу, што, мабыць, не зусім без сувязі было тое пытанне, бо мой бацька, ці то па класавых прычынах, а можа нацыянальных, служыў у польскім войску ў беларуска-літоўскай дывізіі, змагаючыся пад Мінскам, Беразіной, Варшавай і, як большасць жаўнераў гэтай дывізіі, апынуўся на Віленшчыне.


Фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— ***Каторы з народаў звязаных з Вялікім Княствам Літоўскім Вам найбліжэйшы?***

— Ні адзін з гэтых народаў не з'яўляецца мне такім блізкім, бо бачу заадно іх веліч, як і маласць. Нядаўна я наведаў Нясвіж і паглядзеў рэшткі маёнтка, які застаўся ад Радзівілаў. Зараз пасля быў там сусветны з'езд гэтага роду. А ўсё было там нейкае дзіўнае, хоць бы замак Радзівілаў, які парадаксальна адбудоўваецца фірмай імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Калі мусіў бы я шукаць родаў ці асоб мне блізкіх, то, можа, як вучань, пералічыў бы Міцкевіча.

— ***Як Вы сёння глядзіце на цяперашнюю Беларусь?***

— Са спелай трывогай. Падкрэсліваю: спелай. Разумею справу абумоўленасцей і мінулага, ведаю рэзультат гістарычных абцяжаранняў, якія ўплываюць на тое, што ёсць так, а не іначай. Трывожыць мяне, што беларускі народ траціць у значнай ступені сваю культурную, між іншым і моўную, аўтаномію. Гэта эвалюцыя ў бок поўнай залежнасці ад усходняга суседа. Прынамсі пакуль гэта так выглядае. Ці ўдасца ў цяперашніх умовах гэта адвярнуць, а прынамсі прытармазіць, не магу сказаць. Вельмі турбуюся тым, што беларуская мова ў Беларусі сыходзіць на другі план, што не чуваць яе на вуліцы, што карыстаюцца ёю амаль выключна людзі, якія хочуць ратавацца пачуццём патрыятызму. Беларускія культурныя і гістарычныя ўзоры — чужыя беларускаму народу як цэласці. Падмацоўваюцца ў Беларусі нейкія новыя быты, адыходзіцца ад гістарычнай праўды гэтай краіны. Узмацняюцца культурныя сувязі выключна з адным суседам — усходнім. У Беларусі, але і нярэдка на Беласточчыне, лічыцца, што беларуская мова гэта гаворка простага люду, якая не паднялася да мовы інтэлігенцыі ці кіруючых слаёў. Так склалася, што была яна мовай простанароддзя. А шкада, бо гэта старая і прыгожая мова. Калі дзяржава называецца Беларусь, дык хай беларуская мова будзе першапланавай дзяржаўнай мовай. Гэта можна зрабіць. Калі Сталін прыйшоў у Ліду, проста загадаў, што гімназія мае быць беларускай і ўсе мусілі вучыцца пабеларуску. Улада Беларусі, так сказаць, таксама моцная і магла б гэтае зрабіць. Толькі мусіць хацець, але, відаць, не хоча.

— ***Як дайшло да ўзнікнення „Кнігі Вялікага Княства Літоўскага"?***

— У 2004 г. Чэслаў Мілаш, літоўскі паэт пражываючы ў ЗША Томас Вэнцлова і я напісалі інтэнцыйны ліст у гэтай справе. Дайшлі мы да вываду, што ўжо час, каб паказаць месцы звязаныя з гісторый і самую гісторыю гэтых зямель, у час, калі ствараецца ў Еўропе гаспадарчая, палітычная і культурная супольнасць.

— ***І на канец. Як была прынята выстава ў Мінску, якая працягнецца, наколькі ведаю, да канца мая?***

— Вельмі добра. Адбылася яна ў новаадкрытай дзяржаўнай галерэі Акадэміі мастацтваў „Акадэмія". На адкрыцці асабіста прысутнічаў віцэміністр адказны за культуру, рэктары, прафесары, крытыкі і студэнты. Я думаю, што працы, якія я там паказаў, не былі лёгкія для ўспрыняцця, былі яны поўныя сімволікі і метафарычнасці. Але я адчуў, што ўсе яны былі прыязна „глынутыя" і маю надзею, што будуць „перавараны" з карысцю для беларускага мастацкага і калямастацкага асяроддзя. Пасля выставы ў Мінску працы паедуць у Гродна, дзе ў чэрвені будзе вернісаж. Пасля яны вернуцца да мяне і я іх перамадыфікую ды апынуцца яны ў жніўні на вялікай выставе ў Вільні. Вільня, на маю думку, адна з культурных сталіц Еўропы, вельмі пругкая ў культурным плане, ну, і там, вядома, я нарадзіўся. Вільня напэўна не такі сонны і нерухавы горад, як, напрыклад, Беласток.

— ***Дзякуем за размову.***

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Перамога над бяспамяццем

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

На гарадскім могільніку ў Беластоку, над магіламі палеглых салдат і афіцэраў, што аддалі сваё жыццё пры вызваленні Беластока ў ліпені 1944 года, на Дзень Перамогі, 9 мая, маліліся пры праваслаўным крыжы духоўнікі чатырох веравызнанняў. Крыж, пастаўлены тут Генконсульствам Рэспублікі Беларусь, высіцца пры помніку загінулым героям, уфундаваным 25 гадоў таму жыхарамі Беластока. Адзначэнне Дня Перамогі сарганізавалі таксама Генконсульства РБ і Саюз саратнікаў РП і былых палітычных вязняў у Беластоку. Урачыстасць сабрала некалькі соцень ветэранаў з Беласточчыны і Гродна, жыхароў Беластока, прадстаўнікоў улад горада і ваяводства, ваенных аташэ Беларусі і Расіі, прадстаўнікоў меншасных арганізацый, святароў. Шмат хто меў прышпіленую стужку ў аранжава-чорныя палоскі ад ордэна святога Юрыя, заступніка ваенных. Раней дэлегацыя ваенных ветэранаў з Беласточчыны і Гродна ў сто асоб, якія ў радах Савецкай Арміі прымалі ўдзел у ваенных дзеяннях на Беласточчыне і ў змаганнях з Нямеччынай у 1944 г., наведала могільнік у Саколцы, дзе ў ваенных кватэрах пакояцца іхныя саратнікі, а на наступны дзень пабывалі яны ў Рыбалах, Замбраве і Мілейчычах ды ў Гайнаўцы. Мяркуецца, што на тэрыторыі цяперашняга Падляшскага ваяводства аддало сваё жыццё ў баях каля 20 тысяч салдат Савецкай Арміі розных нацыянальнасцей, якіх імёны ў большасці невядомыя, і пакояцца яны ў большасці ў брацкіх магілах.

Ваенныя капеланы чатырох веравызнанняў — праваслаўнага, пратэстанцкага, каталіцкага і мусульманскага маліліся супольна за ўпакой душ палеглых і мір у свеце. Ад імя польскіх мусульман гэтак маліўся ганаровы імам мусульманскай канфесійнай гміны ў Крушынянах Мустафа Ясінскі: „Будзьма талерантнымі. Адкіньма стэрэатыпы і прадузятасці ў адносінах да іншых. Давайце памолімся за ахвяры войнаў, тэрору, дыктатуры, насілля і несправядліваці ў свеце. Памолімся за поўнае ўключэнне ўсіх рэлігійных супольнасцей у справу міру ў свеце". Да помніка былі ўскладзены кветкі ад арганізацый і грамадзян.

Пасля ўрачыстасці ля крыжа генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Міхал Аляксейчык запрасіў ветэранаў і іх сяброў у сядзібу консульства. Там 14 ветэранаў было адзначаных медалямі з нагоды 65-годдзя вызвалення Беларусі з-пад нямецкай акупацыі. Была нагода сустрэцца, бывала, саратнікам, якія змагаліся разам у адных часцях, а ўбачыліся яны ажно больш за 60 гадоў пасля! Штораз менш іх, жывых, тых, хто змагаўся з гітлераўскай навалай. Не ўсім ім прышпільваюць медалі, не ўсе яны даюць рады дайсці на ўспамінныя мерапрыемствы. Для іх словы „дзень перамогі" гэта не пусты гук. Бывае, што пасля салютаў і кветак ім яшчэ цяжэй. Тым больш калі на другі дзень, як 10 мая сёлета, вандалы і прыдуркі апаганяць месца памяці, раскідаюць вянкі, паломяць свечкі, патрушчаць знічы. А гэта ж і за іхні спакой праліта была кроў герояў.

Яны прыйшлі да іх са свечкамі і малітвай

Сумная памяць

Сустрэліся саратнікі з розных краін, якія змагаліся ў адной дывізіі, праз больш чым 60 гадоў!

Размова пра мір — з айцом Гаўрыілам

У Белавежы будуюць і рамантуюць

Мабыць, у кастрычніку бягучага года жыхары Белавежы атрымаюць новы будынак асяродка здароўя. Працы на будове пачаліся ў палове жніўня 2008 года. Фірма „Прэсстэх" Пятра Антанюка з Гайнаўкі справілася з імі паспяхова. Будынак стаяў гатовы ўжо позняй восенню. Навесну пачаліся аддзелачныя працы. Пакуль яшчэ невядома, які будзе лёс старога будынка асяродка. Ён быў здадзены ў карыстанне ў 1928 годзе і сваё, здаецца, адслужыў. Наконт новага будынка белавежцы маюць адну засцярогу — ён пабудаваны блізка могільніка! Ці такое суседства будзе спрыяць хвораму ў хуткім аздараўленні? Трэба сумнявацца. Дадайма, што галоўным інвестарам новага будынка асяродка здароўя з'яўляецца Самастойная публічная ўстанова аховы здароўя ў Гайнаўцы. Кошт будовы складзе каля 1 млн. злотых.

На зломе красавіка і мая г.г. пачаліся доўгачаканыя рамонтна-мадэрнізацыйныя працы на вуліцах Каляёвай і Парковай. Яны таксама ахопяць пачатковы адрэзак вуліцы ген. А. Вашкевіча (менш больш да будынка піцэрыі сп. Сэрамакаў). Працы гэтыя закончацца напрыканцы жніўня г.г. Кошт іх складзе суму 1 млн. 520 тыс. злотых. Даўжыня рамантаваных вуліц — 960 бягучых метраў. Выканаўцам з'яўляецца фірма „Максбуд". Павятовае староства ў Гайнаўцы клапоціцца зараз, каб у будучым годзе адрамантаваць чарговы адрэзак вуліцы А. Вашкевіча (1500 б. м.), да скрыжавання з вуліцай Броўскай. Мяркуецца, што для гэтай мэты спатрэбіцца 2 млн. 100 тыс. злотых.

Пётр БАЙКО

На беларускай ноце

У Гайнаўскім доме культуры 5 мая г.г. адбыўся раённы агляд „Беларуская песня 2009" для дзяцей і моладзі з дзіцячых садкоў, пачатковых школ і гімназій.

У катэгорыі „салісты з пачатковых школ" першае месца заваявала Паўліна Нікалаюк (спявае яна ў Гайнаўскім доме культуры і тут рыхтавалася да конкурсу), другое раўнапраўнае месца занялі Юліта Ваўрэшук (ГДК) і Уршуля Баравік з Комплексу школ у Дубічах-Царкоўных ды трэцяе месца — Матэвуш Харкевіч (ГДК).

У кагэгорыі „салісты з гімназій" першае месца заняла Марлена Беглюк (ГДК) і другое — Наталля Амельянюк (ГДК).

У катэгорыі „вакальныя калектывы з прадшколляў і пачатковых школ" першынство заваявалі „Званочкі" з Прадшколля № 3 у Гайнаўцы і другое — „Званкі" з ГДК.

У катэгорыі „вакальных калектываў з гімназій" журы першага месца не прызнала, а другое месца заняла „Зараначка" з Ласінкі.

У катэгорыі „хары з пачатковых школ і гімназій" першае месца заняў хор з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, другое раўнапраўнае месца — хор „Гіп-гоп" з КШ № 3 у Гайнаўцы і хор КШ у Дубічах-Царкоўных ды трэцяе — хор „Лясная гавэнда" з КШ у Чыжах.

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Знаёмства праз песні, строі і цукеркі

Мы прывыклі, што беларускія песні спяваюць праваслаўныя беларусікі.

— А ў нашай групе толькі двое праваслаўных, — кажа матушка Міраслава Тыханюк з беластоцкага прадшколля № 27 у Беластоку. Дзеткі выступілі не горш за прадстаўнікоў беларускага прадшколля. Дзяўчаткі і хлопчыкі апрануліся ў беларускія касцюмы, якія пазычылі ў прыманастырскага калектыву „Казка" з Супраслі. І з жарам ды выкрутасамі заспявалі: „Ой, у лузе пры далі-не!" Той, хто не ведаў, нават не здагадаўся, што выступаюць маленькія сябры-палякі. Усе думалі, што прыехалі яны з Бельска або Гарадка.

— Ці цяжка было арганізаваць такі гурт? — пытаем у матушкі Міраславы.

— Я сама працую з малодшымі дзеткамі. Таму я пайшла да шасцігодкаў і спытала: хто хоча навучыцца беларускіх песень? Адразу назбіралася група з дзесяці дзяцей. І як жа спадабаліся ім беларускія песні! Калі мы сёння дабіраліся на фестываль, дзеткі не маглі вытрымаць і пачалі спяваць на прыпынку...

Юлія Іванюк

Юлія Баравік (салістка) з сябрамі

Дамініка Козлюк

Спявачкі з Пуньска

Мы сустрэліся на V Фестывалі дзіцячай песні нацыянальных меншасцей Падляшша. Гэтае каляровае і радаснае святачка ўжо чарговы раз арганізавала Польска-беларускае прадшколле № 14 у Беластоку. Мерапрыемства праходзіла ў памяшканні БГКТ па вул. Варшаўскай 11, у аўторак, 12 мая г.г. З ліку гасцей вылучаліся дзеткі з польска-літоўскага прадшколля ў Пуньску. Яны, як адзіныя, між сабой размаўлялі па-літоўску. Так сама звярталіся і да сваёй настаўніцы Ірэны Стаськевіч. І заспявалі тры вясёлыя песенькі пра мурашку, пра сонца і мора і пра дзетак-капрызаў.

— Звычайна выступаем у сваім прадшколлі, — паясняе пані Ірэна, — на Свята мамы ці Свята бабулі. У нас няма занадта многа нагод для выступленняў. Таму вельмі цэнім запрашэнні на такія фестывалі.

— А што тут для вас цікава? — пытаю ў маленькіх спявачак-літовак.

— Народныя строі ў беларусаў, — чую ў адказ...

Адказ здзіўляе, бо ўсе, каго не спытай, кажуць такое пра строі літовак. Асабліва падабаюцца карункавыя чэпчыкі на галовах.

— Яны выглядаюць як тыя вясновыя кветкі-нарцысы, — кажа адна мама з беларускага садка. Беларусы ўсё, што найпрыгажэйшае, параўноўваюць да кветак. На фестывалі, аздобленым квяцістымі вышыванкамі, іх было сапраўды як у вясновым садку... Мяне захапілі салісты з беларускага садка: Ася Мусюк, Вікторыя Пякарская, Юлія Іванюк, Андрэй Такаюк, Дамініка Козлюк, Юлія Баравік, Зося Конюх... Здаецца і не было раней такога высыпу талентаў! Напэўна добры ім прыклад даюць настаўніцы, якія час ад часу выступаюць перад публікай...

— Я хачу ў жыцці стаць спявачкай, — кажа Дамініка Козлюк, — выступаць на радыё, па тэлебачанні. — Дамініка мае моцны голас і ўпэўнена выступае на сцэне. І найбольш ёй падабаецца Дода.

— А калі ты спяваеш беларускія песні, — пытаем у дзяўчынкі, — яны табе падабаюцца?

— Так, так! — заяўляе Дамініка, — Яны мне вельмі падабаюцца, таму што яны падабаюцца майму... дзядулі з Фастаў.

На фестывалі прагучалі яшчэ ўкраінскія песні ў выкананні дзетак з Прадшколля № 9 у Бельску-Падляшскім і руская ў выкананні дашкольніцы з Беластока. А на заканчэнне мерапрыемства ўсіх чакаў салодкі пачастунак!

Вікторыя Пякарская

Дашкольнікі з польскага садка № 27

Вераніка Федарук (прадшколле № 9 у Бельску-Падляшскім)

Фота і тэкст: ЗОРКА

Зося з першага „а” класа

— 31 —

Пасля доўгай маёўкі фарбаваная бландзінка Клара грунтоўна змянілася. Зараз ніхто не сказаў бы пра яе „пластмасавая лялька”. Дзяўчына выглядала прыгожа і натуральна. Ніхто не пазнаў яе, калі ўвайшла ў клас. Яна была апранута ў простую, класічную вопратку. Апрача сказанага, Клара была шатэнкай. Яе твар, пазбаўлены „штукатуркі” з цёмнай пудры, выглядаў намнога маладзей і весялей.

— Нейкая новая вучаніца? — здзівіўся выхавацель Янка Рыбачук.

— Можна і так сказаць, — адказала з усмешкай Клара, — хоць як добра памятаю, я ўжо восьмы месяц у гэтым класе...

Калі дзяўчына села за сваю парту, хлопцы адразу сталі ацэньваць яе новы выгляд. Яны добра памяталі яе дурныя тэксты, але зараз быццам пра ўсё дрэннае забылі. І аднагалосна дайшлі да высновы: Клара выглядае намнога лепш чым раней. Ды што там казаць лепш ці горш, яна выглядае проста класна!

— Я думаю, што гэта ўплыў пройгрышу на выбарах у школьны самаўрад, — сказаў Тамаш. — Паразы часам добра ўздзейнічаюць на людзей.

— А можа яна думае, што дзякуючы такому выгляду пераможа ў наступным годзе, — дакінуў Пеця.

Паўл Пятрушэня маўчаў як магіла. Ён глядзеў на Клару быццам зачараваны. Зося прадчувала, што зноў вяртаецца іх каханне „на зарэз”. Вядома, пасля ўрока фізікі сябры спыталі ў Паўла ці будзе ён сустракацца з Кларай. Хлапец адказаў коратка:

— Так, але толькі ў выпадку, калі яна памяняецца па характары.

Усе замоўклі. Лёгка змяніць фрыз і апранашкі! Горш з дурнымі прывычкамі і такімі ж манерамі...

Хоць... на другі дзень ніхто ўжо не каментаваў цудоўнай перамены Клары. Усё высветлілася яшчэ ў той самы дзень. Пасля ўрокаў яе чакаў прыгожы студэнт архітэктуры. Яны селі ў машыну і ад'ехалі з піскам колаў... Вучні першага „а” класа ад здзіўлення зноў разявілі раты!

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majesz_karowu@tlen.pl

Музыка з кайфам

Шматгалосы гіт!

„Рамонка” з Ласінкі

Рубрыка „Музыка з кайфам” распавядае пра розных выканаўцаў ды разнародныя жанры музыкі. Думаю, што варта таксама ведаць музыку, выканаўцаў і кампазітараў, якія з аднаго боку ствараюць для абмежаванай колькасці слухачоў, з другога — працуюць на ніве культуры для мільёнаў людзей, у тым ліку і беларусаў.

Травень — незвычайны месяц у музычным плане. Падляшша, апранутае ў цудоўную зелень прыроды, адзначае тады свята чалавечага голасу — самага дасканалага інструмента, пры дапамозе якога ствараецца царкоўная музыка. Большасці дзяцей здаецца, што гэта музыка нашых бабуль, якія ўсё сваё жыццё спявалі ў царкве, што для малышоў яна нудная і нецікавая.

А царкоўная музыка, так як і сучасная, моладзевая, мае сваіх класікаў (такіх як гурт „Крама” ў беларускай музыцы ці „The Beatles” у сусветнай), мае таксама свой авангард ды альтэрнатыву (як Мар'я Пэшэк на польскай сцэне ці „Hagual” або „Drum Ecstasy” ў Беларусі). Царкоўная музыка асацыюецца наогул з нейкім жорсткім законам, які наказвае спяваць так, а не інакш, або тое, а не іншае, да чаго мы лёгка прывыкаем молячыся ў царкве. Калі аднак паслухаць запісы хароў з усяго свету, аказваецца, што кампазіцыі, песні і хары можна перабіраць бясконца.

Слухаць царкоўную музыку заахвочваюць фестывалі царкоўнай музыкі. Толькі што закончыліся Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы, а ўжо пачынаецца Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі „Гайнаўка-2009” у Беластоку. У гэтых гарадах можна паслухаць царкоўную музыку ў зусім розных варыянтах, можна купіць запісы харавой музыкі, выконванай не толькі дарослымі, але таксама і дзяцьмі. Спяваюць праваслаўныя і каталікі, пратэстанты і жыды, беларусы і палякі, венгры ды кенійцы. Варта часам глянуць на шматгалосую музыку як на нешта свежае, поўнае энергіі і неспадзяванак ды зусім сучаснае, бо царкоўная музыка, якая заўсёды мае ў сабе элементы малітвы, на працягу апошніх гадоў для хароў усяго свету стала сапраўдным гітам!

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 21

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 17:

Ас, ціс, як, дошка, архітэктар, архідэа, ура, кіт, як, машр, пава, эх, ла, пасцель, каталог. Ар, Аркада, архіў, хітрэц, гіт, хек, тэмп, ла, ідэа, альт, сок, ява, штука, ял, якар, но, карабель.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Марыёля Анішчук, Юстына Тамашук, Агата Грыгарук** з Дубін, **Адрыян Ігнацюк, Аня Каліноўская** з Чыжоў, **Пётр Герасімюк** з Гайнаўкі. Віншуем!



XXVIII Międzynarodowy Festiwal Muzyki Cerkiewnej 2009

PROGRAM FESTIWALU

Opera i Filharmonia Podlaska w Białymstoku, ul. Podleśna 2

INAUGURACJA FESTIWALU
20.05.2009 (środa), godz. 18.00

Otwarcie Festiwalu
Chór Politechniki Białostockiej pod dyr. Violetty Miłkowskiej
Chór Filharmonii w Charkowie (Ukraina) pod dyr. Andrija Sirotienko

Koncert Inauguracyjny
Łesia Diczko „Liturgia Uroczysta” *wykonuje:* **Chór Filharmonii w Charkowie (Ukraina)**
Konstanty Gorski „Zriaszcze mia biezgłasna” *wykonują:* **Chór Politechniki Białostockiej (Polska), Chór Państwowego Uniwersytetu Lingwistycznego w Mińsku (Białoruś), Chór Konserwatorium w St. Petersburgu (Rosja), Chór Filharmonii w Charkowie (Ukraina)**
Chórami dyryguje: Andrij Sirotienko

PRZESŁUCHANIA KONKURSOWE
21.05.2009 (czwartek) godz. 17.00
1. *Chór Staroobrzędowców „Rusalia”* — Kolkia (Estonia)
2. *Chór Mieszany* — Visaginas (Litwa)
3. *Chór Mieszany „Bogorodiczen”* — Bugulma (Rosja)
4. *Chór Kościoła Chrześcijan Baptystów* — Białystok (Polska)
5. *Chór „Cantata” Elbląskiej Uczelni Humanistyczno-Ekonomicznej* — Elbląg (Polska)
6. *Chór Wyższej Szkoły Administracji Publicznej* — Białystok (Polska)
7. *Chór „Cantus Juventae” Państwowego Uniwersytetu Lingwistycznego* — Mińsk (Białoruś)

22.05.2009 (piątek) godz. 15.00
1. *Chór „Melodia” Szkoły Muzycznej im. Hofmana* — Kaliningrad (Rosja)
2. *Wzorcowy Chór Chłopięcy Szkoły Artystycznej* — Swietłogorsk (Białoruś)
3. *Chór „Wohnyk” Pałacu Dzieci i Młodzieży* — Kijów (Ukraina)
4. *Chór Mieszany* — Berlin (Niemcy)
5. *Kameralny Chór „Renesans”* — Jużnoukraińsk (Ukraina)
6. *Chór „Lira” Państwowego Uniwersytetu Mołdawii* — Kiszyniów (Mołdawia)
7. *Chór Mieszany „Educatus” Uniwersytetu Pedagogicznego* — Kraków (Polska)

23.05.2009 (sobota) godz. 15.00
1. *Chór „Primavera”* — Gura Humorului (Rumunia)
2. *Chór Mieszany* — Vranov (Słowacja)
3. *Chór Państwowego Konserwatorium* — Rostów (Rosja)
4. *Chór Uczelni Artystycznej „Schola Cantorum Budapestiensis”* — Budapeszt (Węgry)
5. *Chór „Jarosławna” Uczelni Muzycznej* — Kijów (Ukraina)
6. *Chór Sankt Petersburskiego Konserwatorium* — Sankt Petersburg (Rosja)
7. *Państwowy Chór Kameralny „Polifonia”* — Szaulaj (Litwa)
8. *Państwowy Chór Kameralny Wojsk Lądowych Ukrainy* — Czernihów (Ukraina)
9. *Państwowa Akademicka Kapełła Chóralna Rosji im. A. Jurłowa* — Moskwa (Rosja)

ZAKOŃCZENIE FESTIWALU
24.05.2009 (niedziela)
godz. 14.30 — **Ogłoszenie werdyktu Jury i wręczenie nagród**
godz. 16.00 — **Koncert Galowy**

Аэра-план каля Тапалян

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Царква ў Тапалянах

Сарока-варона кашку варыла, дзетак карміла, аднаму-другому дала, іншаму не дала, — так менш-больш гаворыць дзіцячы размеркавальны вершык, які прывучае наймалодшае пакаленне да няроўнасці, да сацыяльнай несправядлівасці... Вось і наш Беласток не мае ад варшаўскай сарокі-вароны кашкі ў выглядзе прыстойнага рэгіянальга аэрадрома, а мець жа ягонае начальства хоча той аэрадром не абы-які, але такі, якому ў самім Беластоку аж замала месца і трэба яго прызямліць недзе звонку, у каторайсьці з суседніх гмін. Ну, а тыя гміны, як чарговае птушынае пакаленне, таксама разяўляюць свае дзюбанькі на беластоцкую здабычу.

На сёння ў падбеластоцкіх кандыдатаў на галоўны авіяпрыз найвышэй каціруюцца Тапаляны ў Міхалоўскай гміне, абганяючы Жукі ў Заблудаўскай, Саннікі ў Тыкоцінскай і Хлябёткі ў Завадскай. Падаўся я ў „нашы” Тапаляны, каб на месцы разведаць сітуацыю ў цяперашняга наземнага персаналу будучага аэрадрома.

Заглядаю на недалёкі ад аўтобуснага прыпынку панадворак, пабачыўшы там пару пажылых людзей. Яны аказваюцца жыхарамі Беластока, пенсіянерамі, прыехаўшымі на летні час на сваю вясковую вотчыну. На маё пытанне пра іх стаўленне да планаванага тут аэрадрома адказваюць, што і так пра ўсё вырашаць не яны, толькі начальства. А іх гэтае пытанне занадта і не хвалюе. Хачу яшчэ крыху выведаць, якія гэта козыры ў Тапалян, што сюды менавіта ў будучыні маюць браць курс авіялайнеры — мо тут быў калісь ваенны аэрадром?.. У адказ чую, што ніколі там аэрадрома не было, толькі большасць зямлі на тэрыторыі паміж вёскамі Тапаляны, Патока, Геранімова і Тыльвіца, дзе той аэрапорт мае быць, з'яўляецца дзяржаўнай уласнасцю і не было б клопату з яе перадачай для патрэб авіяцыі.

Крыху далей спатыкаю на тратуары пажыленькую бабуленьку гадоў за восемдзесят з касою. Выйшла яна на вуліцу абкасіць падрастаючую насупраць ейнага панадворка траўку. Можа каго і здзіўляць васьмідзесяцігадовая бабулька ў ролі касца, але... так жыццё складваецца. Няма каго папрасіць зрабіць такую работу, у вёсцы адно старыя асталіся. Ёсць і крыху адзінокіх мужчын, але яны п'юць. Была вось яна дала аднаму з такіх мужчын шмат вопраткі і прасіла яго накалоць ёй дроў. Вопратку ён ужо знасіў, але работа ўсё яшчэ наперадзе. Ды і сама жанчына фармавала свой характар у тую эпоху, калі сацыяльным страхаваннем займаліся сямейнікі, а не чыноўнікі, як гэта маецца зараз. І не было ў людзях столькі хлусні і зладзейства, як гэта маецца цяпер. Вось усім загадалі мець умяшчальнікі на смецце, а яна ж не смеціць; і схавала той свой умяшчальнік у хлеў, бо ўжо аднаму вяскоўцу такі ўмяшчальнік з панадворка ўкралі і трэба за яго плаціць. І за ўсё трэба плаціць, напрыклад, за ссячэнне дрэва на сваім уласным панадворку, хаця яна добрасумленна плаціць усе падаткі. А адкуль тыя грошы браць? Вось, крышку пенсію падбавілі, але ж зараз павысілі цану аўтобуснага білета, які з Тапалян у Міхалова каштуе зараз чатыры залатоўкі... А аэрадрома яна апасаецца, бо ж ноччу самалёты спаць не дазволяць.

Яшчэ далей невялічкая прыватная крама, насупраць яе пажылыя жанчына з мужчынам. Пытаю пра іх меркаванне аб аэрадроме. Іх гэты план абнадзейвае, бо ж зараз на вёсцы асталіся толькі старыя, маладыя раз'ехаліся па гарадах і калі тут паўстаў бы аэрадром, то яны можа вярнуліся б, можа вёска акрыяла б. На пытанне, ці наконт аэрадрома адбыліся ў Тапалянах нейкія грамадскія кансультацыі, атрымліваю адмоўны адказ.

Недалёка за крамай будынак былога пункта прыёму малака. Насупраць яго на лавачцы сядзіць худаваты мужчына ўніверсальнага ўзросту. На ягоным ілбе сляды змагання з гравітацыяй, мабыць, ад нейкага парога. Значыць тут, у Тапалянах, ужо закладзена нейкая авіяцыйная традыцыя — традыцыя разборкі з сілай зямнога прыцягнення. Пасля абмену некалькімі сказамі наконт малочнай мінуўшчыны вёскі мужчына звяртаецца да мяне з ветлівай просьбай даць яму злот і дзевяноста грошаў, на піва, бо ў яго страшэнная мука ад перапою. На гэта я яму параіў напіцца вадзічкі, бо ад піва можа быць чарговая мука. Аказваецца аднак, што вада майму суразмоўцу агідная, ён і глядзець на яе не хоча. Магчыма, што ён ужо ўвайшоў у той свет, дзе асноўным кампанентам жыцця з'яўляецца піва або нешта яшчэ мацнейшае. Астраномы шукаюць іншага жыцця ў заавіяцыйным космасе, а яно, тое іншае, тут, побач нас...

У канцы Тапалян, што ад Міхалова, стаяць дзве пустуючыя хаты з багатай вонкавай арнаментацыяй; яшчэ дзве так аздобленыя хаты ўдалося мне пабачыць у вёсцы: адна абжытая пастаянна, другая толькі ў летні сезон. Мабыць, жылі ў іх найбольш крэатыўныя людзі, а іх гэтак жа напорыстыя наследнікі, размаху думак якіх было зацесна ў сваёй мясціне, падаліся ў найшырэйшы свет, за трыдзевяць зямель ад бацькоўскіх гектараў і вытанчаных продкамі хат; вялікім караблям вялікія плаванні... З боку Міхалова, на задворках вёскі, астатак колішняга эскаэра. Пляц з будынкамі цяпер у прыватным уладанні, нядаўна працаваў там тартак, але яго ўласнік зараз за граніцай.

Арнаменты тапалянскіх хат

Вяртаюся загуменнем з боку намечванай узлётна-пасадачнай паласы. На яе цяперашнім месцы аблагоў няма, поле абробленае, пашы не запушчаныя, ёсць затое шмат маладых зараснікаў,

якія выглядаюць быццам грыва на далікатным узвышшы паміж Тапалянамі і Патокай. Да вуліцы вяртаюся абагнуўшы вялікі стаў з паўднёвага боку вуліцы пасярэдзіне вёскі.

За драўлянай царкоўкай, пабудаванай у канцы XVII стагоддзя, сядзяць на лавачцы трое: дзве жанчыны і мужчына. І яны, так як і мае ранейшыя суразмоўцы, адзначаюць, што ў вёсцы асталіся адно пажылыя. Гаспадароў, якія яшчэ па-гаспадарску абрабляюць поле, асталося тут бадай шасцярых. Ёсць і мужчыны, якія беспрасветна п'юць; двух такіх жыве ў хаце амаль насупраць лаўкі. Наконт аэрадрома няма рашучых меркаванняў, адно апаска, што самалёты скаламуцяць цяперашні спакой.

Мужчына інфармуе мяне, што мясцовая царква мае за трыста гадоў і раней яна была філіяльнай прыхода ў Патоцы. Раней у Патоцы было сто восемдзесят сем'яў, зараз будзе там іх каля пятнаццаці. А ў Тапалянах было за дзвесце гаспадарак. Траціну насельніцтва вёскі складалі калісь каталікі, дзве траціны — праваслаўныя; цяпер іх па палове...

Пытаю пра школу. Былы школьны будынак недалёка, насупраць дарогі ў Патоку, зараз у прыватным уладанні. Уласнік паставіў ужо на школьным пляцы новую хату. За абнаўленне школьнага будынка ён яшчэ не браўся; што ён думае ў ім рабіць — невядома...

Дарога з Тапалян у Патоку — жвіровая, яе, паводле дарожнага ўказальніка, тры кіламетры. На прыдарожным палетку працуе трактар; мо за лічаныя гады заміж трактароў будуць тут калясіць авіялайнеры; на паўднёвым схіле, з боку Патокі, таксама працуе трактар. Але... Недалёка ад Патокі заўважаю жоўтыя слупкі — паметкі той залатой жылы, якая сыценька корміць Міхалоўскую гміну, паметкі Ямальскага газаправода. Нечаму дзівавацца, што Марк Назарка, міхалоўскі войт, так зацікаўлены пабудовай аэрадрома менавіта ў ягонай гміне. Прыгадаць яшчэ варта, што ўзамен за налогі ад чыгункі войт Назарка прафінансаваў пабудову дарогі з Жэдні ў Саколле. І ад аэрадрома таксама думка пра немаленькі прыбытак, які добранька пагрэе не толькі душы міхалоўскіх рахункаводаў, але і ўсё тамашняе чынавенства.

Пры нагодзе цёплых думак пра ролю аэрадрома варта яшчэ пашнарыць крыху ў часе, калі здавалася, што ён будзе амаль у самім Беластоку, у Крыўлянах. Было ж апрацавана для яго нейкае абгрунтаванне... Але на Крыўлянах адбылася некалі імша з удзелам папы Яна Паўла II, а гэта ў нашым тутэйшым куточку Еўрасаюза падзея такой павагі, што многія вернікі лічаць неабходным прыярытэтам пабудаваць у тым месцы санктуарый; аэрадром можа быць і ў іншым месцы... А многія вернікі, гэта ў нашых умовах акрэслены электарат, якому кемліваму палітычнаму дзялку абавязкова трэба прыдабрыцца. Чаму ж тады не апрацаваць абгрунтаванне, што Крыўляны пад пабудову аэрадрома не падыходзяць? Сёння такі час, што можна выпрацаваць любое абгрунтаванне — столькі ў нас адукаванага народу, што ён апрацуе абгрунтаванне любога кшталту; Крыўляны апынуліся на афсайдзе... Не магу стрымацца ад думкі, што і наш міхалоўскі войт можа быць гарачым энтузіястам карысных сабе меркаванняў нашых універсальных спецыялістаў, што можа і ён за санктуарый у Крыўлянах...

Здаецца мне таксама, што некаторую ролю ў катавасіі вакол беластоцкага аэрадрома сыграла і насельніцтва Беларусі. Калі б яно пятнаццаць гадоў таму абрала такі палітычны курс, як суседнія Літва з Латвіяй, не было б сёння тых „райскіх дзвярэй", якія не дазваляюць свабоднага руху паміж Гроднам і Беластокам. А ад Беластока да гродзенскага аэрадрома раптам толькі пяцьдзесят кіламетраў далей чым да Тапалян... Можа каго здзіўляць такая думка, бо ці ж напрамкі беластачан супадалі б гродзенскімі авіямаршрутамі?.. У мяне яшчэ іншыя сумненні: ці ў Беластоку збяруцца дастатковыя пасажырскія патокі (у Рым, Лондан, Брусель?), па якія захочуць прылятаць авіякампаніі? Ці той беластоцкі аэравакзал не запустуе так, як не так даўно пабудаваныя чыгуначныя вакзалы ў Бельску або Гайнаўцы? Ці рэгіянальны беластоцкі аэрадром не робіцца адно для нашых хлопцаў-маршалкоўцаў?..

Школа жыцця ў патоцкім дэпо

Сама перада мною заязджае ў Патоку гімбус, з якога высыпаецца васьмёра дзяцей; пасля даведаюся, што гэта дзеці з дзвюх асадніцкіх сем'яў; у аўтахтонаў школьных дзяцей ужо няма. Выгляд вёскі прыгнятальны: шмат тут хат без будучыні. Заглядаю ў будынак пажарнага дэпо... У старэнькім дэпо ёсць новыя, абабітыя бляхай, дзверы, але і стары праём з выламаных дзвюх дошак — карыстаюся ім... Усярэдзіне пінгпонгавы стол, крыху збоку столік з крэсламі, а на століку пустая шкляная тара...

Побач дэпо даўно бяздзейны пункт прыёму малака, а насупраць царкоўны пляц. Перад суседняй хатай сядзіць на лавачцы пажылы мужчына, заводжу з ім гутарку, пытаю пра будынак дэпо. У адказ чую, што ў ім цяпер мясцовая моладзь патайком вучыцца курыць.

Мой субяседнік інфармуе мяне таксама, што ў царскі час была ўзведзена ў Патоцы мураваная царква, якой званіца была вышэйшая за царкоўную і касцельныя вежы ў Заблудаве. Невядома толькі, ці ўдалося ў ёй правесці хаця адну службу. Уся Патока была ў царскі час праваслаўная і ўсе яе жыхары ўцяклі перад немцамі ў бежанства. Вёска зусім апусцела. Калі занялі яе немцы, яны праводзілі тут вучэнні, скідалі бомбы. Назіральныя акопы выкапалі яны на ўзвышшы з паўночнага боку Патокі, з боку Тапалян, акурат там, дзе цяпер прадбачваецца пабудова аэрадрома. Адна бомба разбурыла будынак духоўнай семінарыі, што стаяў нейкіх дзвесце-трыста метраў насупраць царквы, на поўдзень ад вёскі. Другая бомба падарвала адзін, паўночны, бок царквы; у такім стане царква прастаяла міжваенны перыяд. Саветы разабралі сцены царквы і матэрыял ад іх скарысталі пры пабудове машынна-трактарнай станцыі ў Рахвалаўцы. Асталася толькі званіца, але тую ўзарвалі чарговыя, нямецкія акупанты, перад гэтым загадалі жыхарам суседніх будынкаў шчыльна пазакрываць вокны. Цяпер ад патоцкай царквы астаўся толькі абрыс фундаментаў.

Ад той першай нямецкай бомбы, якою была падарвана царква, асталася глыбокая яма, якая напоўнілася вадою. Пазней тую яму абмуравалі і накрылі — служыла яна супрацьпажарным вадаёмам. Зараз яма тая закрыта бетоннай плітой, на якой пакрыўленая агароджа з металічных слупкоў і расцягнутага між імі дроту сантыметровага дыяметра.

У гэтым месцы варта яшчэ слоў некалькі прысвяціць патоцкай царкве. Першая, драўляная царква была пабудавана тут у пачатку XVIII стагоддзя для адмовіўшыхся ад уніі праваслаўных, бо да таго часу тапалянская царква стала ўніяцкай. У палове 1830-х гадоў уніяцкі Тапалянскі прыход быў распушчаны і далучаны да праваслаўнага прыхода ў Патоцы. З ходам часу патоцкая царква ставалася цеснай і наспела патрэба пабудовы новай; мураваны храм быў узведзены напярэдадні першай сусветнай вайны...

Падаюся ў бок Ахрэмавіч. На канцы Патокі два крыжы-помнікі. Праваслаўны крыж каменны, з 1906 года. Каталіцкая каплічка цэментная... Год ці два таму драўляная агароджа вакол яе была павалена, зараз там агароджа з металічных балясаў. І сам помнік памаляваны, адно толькі разам з ім замаляваны і надпісы на ім; а шкада, бо можна было іх пазначыць нейкай кантрастнай фарбай. І ў лесе, якіх сто-дзвесце метраў за Патокай, таксама стаіць крыж-помнік з надпісам „В память всех почившых православных християн 25 VII 1950 г."

Недалёка ад скрыжавання з дарогай з Каўпакоў у Подваркі таксама стаіць пастамент, але без крыжа. І слупкі вакол яго стаяць, але без агароджы; стрыжні на драўляных слупках паказваюць, што агароджа была металічная. Цалкам магчыма, што пастаўлены ў лесе культавы аб'ект стаў прынадай для святатацкіх гандляроў металам...

Малынка задзіўляе сваёй ціхмянай адцывілізаванасцю. Вуліца ў вёсцы з пясочным насцілам, хат там будзе не больш за дзесяць. Большасць іх яшчэ традыцыйнага дызайну, хаця паяўляюцца там і новыя ўзоры. Магчыма, што неўзабаве над ціхую, атуленую лесам вёсачку, уварвецца гул рэактыўных авіярухавікоў.

Усё далей і далей ад твайго дома

Усё далей, усё далей мой легкавік — ад твайго дома. Ад дома, дзе сціплая, снежная чысціня і вішнёвы спакой, дзе пахне яблычным пірагом і тваімі вуснамі. Ты дазваляеш мне іншым разам кранацца іх — але ў такія хвіліны не заплюшчваеш да канца сваіх вачэй, нібы хочаш нешта знайсці, прачытаць у вачах маіх: ці знаходзіш ты там мой выразны адказ, мілая?

Усё далей, далей і далей мой легкавік — ад твайго дома. Ад дома, які ведае самую лепшую таямніцу. Таямніцу, якую стварылі мы разам з табой, і якую ведае тое плюшавае ільвянятка, што сядзіць цяпер побач са мной на пасажырскім сядзенні, і якое спалохана-зверавата стаілася, калі ўжо я сам патануў у шурпатай бездані тваіх вачэй, і абрынулася столь, у пакой уварваўся цытрынавы вецер, а твае тонкія пальцы з акуратнымі, вострымі пазногцікамі, афарбаванымі чорным, паласавалі аголеную душу маю, белыя прасціны, маю спіну.

Толькі ўсё далей, усё далей мой легкавік — ад твайго дома. Ад дома, дзе я магу легчы проста на падлозе, а ты апусцішся побач; і вось, паклаўшы табе голаў на калені, кранаюся дрыготка-асцярожна тваіх валасоў, нібы залацістых струменяў дажджу, напіцца якімі — немагчыма. А можна проста задыхнуцца адчайна, да туманнай, гаркавай, неабдуманай той бязмежнасці, што хавае цябе, хавае мяне, хавае нас з табой, мілая, ад усяго свету. Можна проста забыць, што ёсць яшчэ нешта, акрамя тваіх кашэчых, сарамліва-гарэзлівых рук, тваіх прахалодных, як брусвічкі снежаньскай раніцай, шчок, твайго кончыка язычка, які, пакакетнічаўшы, усё ж вільготна ловіцца на мае суворыя мужчынскія прынады...

Але далей, усё далей мой легкавік — ад твайго дома. Ад дома, з якога я выходжу і, каб крый Божа, ты не заўважыла, адышоўшы крыху, азіраюся асцярожна, каб яшчэ раз кінуць пагляд на акно, за якім — застаешся ты, да самотнасці блізкая, самая неразгаданая мая жанчына. Дзе застаецца твой свет, у якім — сціплая, снежная чысціня і вішнёвы спакой, дзе пахне яблычным пірагом і тваімі вуснамі.

Усё далей, усё далей мой легкавік — ад твайго дома.

24.12.2008

Ігар СІДАРУК

ЗАПРАШЭННЕ

Кафедра беларускай культуры, філалагічны факультэт Універсітэта ў Беластоку запрашаюць 21 мая гг. на даклад з цыкла Беларускія чацвяргі:

праф. Мікалай Давідзюк — „Неаўнія і праваслаўе ў II Рэчы Паспалітай".

Пачатак: г. 17.00, вул. Лінярскага 3, з. 1 В, Беласток

Сустрэча з гродзенскімі студэнтамі

У сераду, 6 мая 2009 года, у дзень маіх імянін ад Кафедры беларускай філалогіі Беластоцкага ўніверсітэта, а канкрэтна ад праф. Яна Чыквіна і праф. Галіны Твараповіч атрымаў я цудоўны падарунак. А была ім мая аўтарская сустрэча са студэнтамі ды выкладчыкамі з Гродна. Спатканне з маладымі людзьмі ды іх апекунамі адбылося пры нагодзе абмену студэнтамі, які адбываецца штогод, калі студэнты з Беларусі прыязджаюць наведаць Беластоцкі ўніверсітэт.

Гродзенскія студэнты перад рэдакцыяй „Нівы"

Вярнуўшыся з багаслужэння з нагоды свята Юрыя, якое адбылося у Юр'еўскай царкве ў квартале Новэ Място ў Беластоку, я меў толькі паўтары гадзіны каб з'есці абед, узяць душ, выпіць каву ды пайсці на сустрэчу на ўніверсітэце. Да таго сябры ды сям'я разваніліся з віншаваннямі, а калега пазваніў, што праз пару мінут мяне наведае. У дадатак мяне яшчэ разбалела галава і, безумоўна, усе святочныя сустрэчы трэба было перакласці на іншы тэрмін. І так, апрануўшыся ў вопратку паводле элегантнага класічна-паэтычнага фасону, падаўся я на ўніверсітэт. Там яшчэ прыйшлося мне чакаць пару мінут студэнтаў аж урэшце разам з д-р Нінай Рачкевіч, д-р Аннай Саковіч ды мгр Іааннай Голец я падаўся на сустрэчу з гродзенскімі студэнтамі. Увайшоўшы у залу, я быў прыемна захоплены, што зала была запоўнена студэнтамі з Гродна. Са студэнтамі было двое выкладчыкаў: Ала Петрушкевіч — выкладчыца літаратуры, а заадно вядомая беларуская паэтэса і літаратурны крытык, а прытым рэцэнзентка майго навейшага зборнічка ды Мікола Грынько.

Прысутных прывітала выкладчыца беларускай літаратуры д-р Анна Саковіч. Яна коратка прадставіла маю асобу. Пасля я ў пару словах расказаў пра сваю асобу, пра мае літаратурныя дасягненні ды пачаў знаёміць студэнтаў з маёю паэтычнай творчасцю. Чытаючы вершы, я коратка характарызаваў, што я, як аўтар, хацеў сказаць чытачам. І так прагучала некалькі лірычных вершаў пра каханне з майго першага зборніка „Субота ў Малінніках", выдадзенага ў 2005 годзе, а пасля я чытаў толькі вершы з навейшага зборнічка „Самота дажджу", выдадзенага ў сакавіку гэтага года. Прачытаў я таксама некалькі зусім новых вершаў, якія пакуль не з'явіліся ў друку, бо ж яны напісаны пару дзён да сустрэчы. Чытаючы вершы, далося мне заўважыць зацікаўленыя ды заслуханыя прыгожыя твары маладзенькіх гродзенскіх студэнтак, якіх у зале была большасць. Гэтыя беларускія красуні вылоўлівалі словы ды фразы з маіх вершаў ды пыталі мяне пра ўсё, што іх цікавіла наконт маёй творчасці ды будзілі ўва мне заадно захапленне, разгубленасць, а таксама нясмеласць. Былі пытанні пра мае творы, пра працэс пісання вершаў, пра аўтараў, творчасць якіх паважаю і найчасцей чытаю. Адна студэнтка запытала, чаму ў маіх вершах пераважае сумны настрой. Я адказаў, што навейшы мой зборнічак нарадзіўся ў пакутах, што натхніла мяне дарослае жыццё, у якое прыйшлося мне ўвайсці з расчараваннем, так як большасці маіх сяброў-выпускнікоў. А я ж — люстра маладога пакалення, якое гаворыць адным голасам ад сэрца і душы ўсіх маладых людзей Беласточчыны. Іншая студэнтка спытала пра мой ідэал жанчыны. На гэтае ж пытанне можна толькі адказаць адно, што ідэалаў як жанчыны, так і мужчыны няма, а сам гламурны мадэль жаноцкасці ці мужчынскасці, на жаль, стварыла поп-культура, якой прасякнуты сусветныя масмедыі. А вядома ж, паэт мае нейкую сваю музу (або некалькі муз), але гэта вялікая тайна, якая раскрываецца ў маіх вершах. Другая дзяўчына абяцала, што пасля гэтай сустрэчы народзяцца толькі вясёлыя вершы. Пасля ў зале з'явіліся вясёлыя сардэчныя усмешкі. Бо ж гэта прыгожыя беларускія дзяўчаты, у большасці мае музы і вобразы майго захаплення.

Пасля сустрэчы ўсім ахвотным дарыў я свае зборнічкі паэзіі з аўтографамі. Прыйшлося мне таксама замяніць некалькі слоў з выкладчыкамі Гродзенскага ўніверсітэта. Дзякую д-р Але Петрушкевіч і д-ру Міколу Грынько за сустрэчу са студэнтамі. Пані Але Петрушкевіч дзякую таксама за цікавую рэцэнзію майго паэтычнага зборнічка. Размаўляў я таксама са студэнтамі, сярод якіх была ўнучка Алеся Белакоза — вядомага дырэктара літаратурна-краязнаўчага музея ў Гудзевічах на Гродзеншчыне. Вельмі прыемна ўспамінаю сустрэчу з сардэчным і добрым Алесем Белакозам, які ў 2003 годзе падарыў мне зборнічак паэзіі М. Арла, творчасцю якога я да гэтай пары захоплены. І тут не спадзяваўся я, што ў спадара Алеся вырасла такая прыгожая, разумная ды інтэлігентная ўнучка Вера. Дзякую ўсім студэнтам і выкладчыкам Гродзенскага ўніверсітэта за сардэчную сустрэчу і за вялікае зацікаўленне маёй творчасцю, за тую цеплыню і дабрыню, з якой успрынялі яны маю асобу. Я, беларускія дзяўчаты, зачараваны вашай прыгажосцю, захоплены маладосцю і абдораны вашай сардэчнай, шчырай ласкай, за што кажу вам вялікае дзякуй. Жыве Беларусь!

Юрка БУЙНЮК

Беларусь,беларусы...

Расповеды пра казачнага хлопчыка-чараўніка Гары Потэра некалькі гадоў таму цікавілі мноства людзей на планеце. Ля кнігарняў у некаторых краінах выстройваліся вялізныя чэргі, дзе месца трэба было займаць ледзьве не з вечара, каб раніцой стаць уладальнікам новай кнігі аб малым чарадзеі. Не абмінула гэтая пасія і беларусаў, аб чым сведчыць сайт у інтэрнэце, які мае арыгінальную назву BelPotter.

Каб выйсці на адзіную, бадай, інтэрнэт-бачыну пра „беларускамоўнага" Гары Потэра, трэба набраць на сваім камп'ютары адрас http://belpotter.by/by. Перад нашымі вачыма адкрыецца зіхацячае таямніцай выяўленне, маючае фонам чорны колер.

Сказаць, што на сайце змешчана амаль уся інфармацыя пра Гары Потэра, гэта значыць не сказаць нічога. Застаецца толькі здзіўляцца, што асоба казачнага хлопчыка стала прычынай з'яўлення кніг, фільмаў, гульняў.

Сайт мае мноства рубрык і чалавеку не надта апантанаму расповедамі ў стылі „фэнтазі", магчыма, не ўсе яны будуць цікавымі. Таму напачатку найлепей клікнуць на выйсце да старонкі „Пра сайт", каб паспрабаваць зразумець, што рухала яго стваральнікамі, улюбёнымі ў Гары Потэра (ГП).

„Летам 2006 года я задумаўся: ці ёсць у інтэрнэце пераклад Гары Потара на беларускую? — пытаецца скромны аўтар сайта, не раскрываючы свайго імя. — Вядома, я нічога не знайшоў, таму вырашыў сам перакласці. Але для таго, каб карыстальнікі інтэрнэту змаглі знайсці і прачытаць пераклад, трэба не толькі перакласці, але і стварыць сайт. Спачатку па адрасе http//belpotter.at.tut.by з'явілася амаль пустая старонка з некалькімі спасылкамі на перакладзеныя раздзелы. Праз некаторы час на гэтай старонцы я пачаў публікаваць навіны міру ГП. Яшчэ не выйшла 7-я кніга і 5-ы фільм, таму іх было шмат. Сайт стаў прыгажэць і напаўняцца новым кантэнтам".

У рэшце рэшт сайт напрыгажэў да таго, што цяпер над ім працуе ўжо не адна асоба, аб чым паведамляецца ў той рубрыцы-прэзентацыі. І варта адзначыць, што робяць яны сваю справу нядрэнна. Праўда, некаторыя старонкі чамусьці не маюць пакуль сваёй беларускамоўнай версіі. Прыкладам гэтаму — рубрыка „Усе" з усімі навінамі пра герояў сучаснай казкі для дзяцей і дарослых.

Сайт, акрамя беларускай, мае таксама рускую і англійскую версіі. Цікава, што клікнуўшы на значок з пазначэннем англійскай мовы, адпаведная версія адкрываецца не адразу. Трэба пачакаць колькі імгненняў, пакуль ідзе аўтаматычны пераклад з рускай мовы на англійскую праз сістэму Google Translate. Інтэрфейс сайта па выніках перакладу застаецца тым жа самым.

Нягледзячы на арыгінальнасць сайта, цяжка сцвярджаць, што ягоная папулярнасць у Байнэце вельмі вялікая. Калі зазірнуць у „Гасцевую кнігу", то за два гады існавання „беларускага" Гары Потэра свае адносіны да такой з'явы выказала зусім мала наведвальнікаў. Магчыма, што прычынай такога стаўлення да выдуманага падлетка-чарадзея ў акулярах стала некаторае, але агульнасусветнае, зніжэнне інтарэсу да гэтага казачнага персанажа.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Без галоўнай інтрыгі?

Здаецца футбольны чэмпіянат краіны толькі пачаўся, а між тым ужо мінула амаль трэцяя яго частка. Пакуль яна змясціла больш негатыўных уражанняў, чым станоўчых. Шэраг скандалаў, нераўнамерны каляндар хатніх і гасцявых гульняў, нізкая выніковасць бальшыні камандаў, кепская рэклама і, як следства дзвюх апошніх рэчаў, малалюднасць на бальшыні стадыёнаў. Праўда, сярэдняя колькасць наведнікаў арэнаў сёлета складае крыху больш 3 тысяч заўзятараў на гульні, што больш на 500 чалавек, чым летась. Але гэта пакуль. Самае прыкрае для турніру, што хутчэй усяго знікае яго галоўная інтрыга — барысаўскі БАТЭ так ірвануў са старту, што ўсе астатнія выстраіліся за ім толькі на значнай адлегласці. Чэмпіёны краіны выйгралі ажно 7 стартавых матчаў і страцілі ачкі толькі ў восьмым туры, калі згулялі дома ўнічыю з мікашэвіцкім „Гранітам". Апошні, больш чым сціпла пачаўшы, бадзяючыся па чужых арэнах, атрымаўшы свой стадыён у Лунінцы, на вачах ператвараецца з безнадзейнага аўтсайдара ў пагрозу аўтарытэтам. „Граніт" на прэзентацыі адрэстаўраванага спартыўнага аб'екта ўзяў верх над мінскім „Дынамам", а цяпер папсаваў серыю і падначаленым Віктара Ганчарэнкі. БАТЭ зараз мае 22 ачкі, а яго галоўным пераследнікам паранейшаму бачыцца сталічнае „Дынама", якое адстае на 8 пунктаў. Бела-блакітныя не надта спрытна „запрагаюць", але ўсё ж здольныя паехаць куды хутчэй. А вось галоўным расчараваннем першынства становіцца салігорскі „Шахцёр", якому многія, у тым ліку і аўтар гэтых радкоў, прадказвалі ролю прэтэндэнта на серабро-бронзу і патэнцыйнага канкурэнта БАТЭ. На пачатку салігорцы апраўдвалі авансы і выйшлі ў фінал Кубка Беларусі, але потым нешта ў іх механізме разладзілася. Кульмінацыяй сталі рэзкія выказванні галоўнага трэнера „Шахцёра" Юры Вяргейчыка, які звінаваціў федэрацыю футбола ў пратэкцыянізме, а арбітраў — у несумленным судзействе. А потым падаў у адстаўку. Рэзкія словы Вяргейчыка маглі быць і перабольшваннем, але спадабалася, што ў нашым футбольным балоце канфармістаў і прыстасаванцаў знайшоўся чалавек, які не пабаяўся выказаць свае думкі. Ёсць, праўда, яшчэ прадстаўнік мінскага „Дынама" Генадзь Туміловіч, але той усё больш матам выслаўляецца за што зусім нядаўна і атрымаў адпаведны грашовы штраф. Вяргейчык жа падаў у адстаўку, якая пакуль не была прынята, кіраўніцтва клуба проста адправіла яго ў адпачынак. А федэрацыя дыскваліфікавала яго на некалькі матчаў і пакарала рублём.

Гродзенскі „Нёман" па-заліхвацку стартаваў, але потым рэзка збавіў абароты. Дзіўнымі здаюцца нараканні галоўнага трэнера Алега Радушкі на тое, што каманда не вытрымлівае жорсткага графіка гульняў, стамілася фізічна. Паўстае натуральнае пытанне: чым тады займаўся калектыў у перадсезонную падрыхтоўку і хто адказвае за функцыянальны стан гульцоў? У цэлым „Нёман" стараецца, але гуляе невыразна і вельмі мала забівае — 6 галоў у 8 матчах наўрад ці могуць задавальняць прыхільнікаў каманды, якая ў мінулую суботу першай згуляла пяцісоты матч у айчыннай вышэйшай лізе. У ім з лікам 1:0 быў абыграны „Віцебск", над галоўным трэнерам якога Аляксандрам Хацкевічам ужо завіс дамоклаў меч адстаўкі.

З асобных футбалістаў найбольш яркае ўражанне пакідае хаўбек БАТЭ Сяргей Крывец, дарэчы, выхаванец гродзенскага футбола. З 7 галамі ён ідзе лідарам у спісе лепшых бамбардыраў і акрамя гэтага выяўляе сябе як цікавая асоба. Так, зусім нядаўна, хіба першым з беларускіх футбалістаў, пачаў пісаць свой інтэрнэтавы блог на роднай мове.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

„Шасцёрка” можа вылезці нам бокам

З цікавасцю і з нейкай трывогай прачытаў я вялікі рэпартаж „Быццам шасцёрка ў «таталётка»” Аляксея Мароза („Ніва” № 17), дзе гаворка пра пабудову вялікай фабрыкі мэблі на тэрыторыі Арлянскай гміны шведскай фірмай „Ікея”. Маўляў, працу ў ёй могуць атрымаць дзве тысячы чалавек, сённяшніх беспрацоўных. Гэта, на першы погляд, абнадзейвае, але якім коштам гэта адбудзецца? Бо ж толькі наіўны чалавек паверыць, што кіраўніцтва нейкай „Ікеі” такое спрыяльнае нам, беларусам, бо сучаснейшую інвестыцыю з навейшымі тэхналогіямі хочуць пабудаваць у нас і даць нам райскае жыццё і перспектыву на будучыню...

Наша доля „Ікею” не хвалюе і не нас яна палюбіла, а палюбіла недалёкую Белавежскую пушчу і навакольныя лясы. Бо адтуль гэтая фірма будзе сваімі магутнымі аўтафурамі цягнуць сабе высечаную драўніну. І, карыстаючыся сённяшняй тэхнікай, яна за дзень можа высечы столькі лесу, колькі ў міжваенны час англійская фірма высякала за месяц, а яна нашай пушчы не шкадавала. І бальшавікі-вызваліцелі з 1939 года да самай вайны 1941 года таксама не давалі Белавежскай пушчы промаху і знішчалі яе як маглі. „Ікея” мае свае філіі ў іншых мясцовасцях Польшчы і там лясы пад пагрозай ад яе. І заробак рабочага там сягае больш-менш васьмісот злотаў, а напрацавацца трэба.

Так, Арлянская гміна збагацее, без пратэстаў пазволіла будаваць на сваёй тэрыторыі фабрыку мэблі і хваліцца цяпер сваім „дасягненнем”, што некалькі тысяч чалавек атрымае працу. Аднак ад гэтага пацерпіць пушча і навакольныя лясы і тут ахоўнікі прыроды нічога не затармозяць дзеля ратавання нашага прыроднага цуда. Ну, сёння Польшча з’яўляецца амаль калоніяй Захаду і там прымаюцца рашэнні, як мы павінны танцаваць пад іхнюю музыку.

Гэта адзін бок медаля, а ёсць і іншы. Высечаную драўніну будуць вазіць магутнымі аўтафурамі па нашых і так раз’езджаных дарогах. І скора яны паразбіваюць нашы жвіроўкі і асфальтоўкі ды шашу Гайнаўка — Кляшчэлі ці Гайнаўка — Бельск. А найзручней драўніну вазіць праз маю вёску Дубічы-Царкоўныя, бо яна распаложана ў стратэгічным месцы і ніводная вайна яе не мінула. А мы такія людзі, што ніколі не пратэстуем і хочам быць вельмі добрымі кожнаму.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Аўтарская сустрэча

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

Уладзімір Саўчук падпісвае кніжкі (першы злева: бацька паэта Ян Саўчук)

Штогод у траўні арганізуюцца мерапрыемствы, прысвечаныя кніжцы і друку. Сёлета ад 8 па 15 мая адзначаўся Тыдзень бібліятэкі. З гэтай нагоды бібліятэка ў Чаромсе арганізавала аўтарскую сустрэчу з паэтам, ураджэнцам Кузавы Уладзімірам Саўчуком. Сустрэча праходзіла ў мясцовым асяродку культуры. Пачаткова з відэакасеты дэманстраваўся тэлефільм зрэалізаваны Беластоцкім тэлебачаннем у 1998 годзе ў Кузаве, у якім Уладзімір Саўчук распавёў аб мінулым і сваёй творчасці. Затым выступіў сам аўтар. Расказаў ён аб тым, як сутыкнуўся з беларускім асяроддзем у Беластоку, як ставіў першыя крокі ў паэтычнай творчасці ў „Парнасіку” на старонках „Нівы”. У мерапрыемстве ўдзельнічала больш сотні асоб, у асноўным вучняў Пачатковай школы і Гімназіі. За так шматлікую аўдыторыю паклапаціліся настаўнікі і кіраўнік Гміннай бібліятэкі Тамара Кердалевіч. Школьная моладзь чытала вершы аўтара на беларускай і польскай мовах, якія з вучнямі падрыхтавала настаўніца Альжбета Раманчук. Сярод прысутных былі настаўніца-пенсіянер Яніна Скок, якая ў дзевяностых гадах вучыла Уладзіміра Саўчука ў чаромхаўскай падставовай школе і бацька паэта Ян Саўчук, пенсіянер. Сустрэча завяршылася ўручэннем аўтару кветак.

Уладзімір СІДАРУК

Ачышчальня

Калі ў Дубічах-Царкоўных пракладалі каналізацыю, ачышчальню сцёкаў пабудавалі паміж плябаніяй і могілкамі, на заходняй акраіне вёскі, недалёка царквы і школы. Выканалі яе, здавалася б, паводле ўсіх сучасных правіл, каб ад яе не было смуроду. На жаль, атрымалася інакш і ў цёплы час ад ачышчальні нясецца смурод, ад якога можна затхнуцца. І хто нюхае той непрыемны пах? Вучні нашай школы, настаўнікі, прычт і прыхаджане нашай царквы, жыхары суседніх панадворкаў і прахожыя. Я гэтага паху не чую, бо жыву ў іншым канцы вёскі. Хадайнічалі ў гэтай справе бацюшка і настаўнікі, прасілі ў гміне, каб нешта ў ачышчальні паправіць каб так не смярдзела, нават кудысь пісалі. І прыязджала камісія, а як жа! Аднак ніякіх хібаў, неахайнасці і фальсіфікацый не знайшлі. Усё, паводле іх, у парадку. А смярдзіць надалей, так як смярдзела раней.

Мікалай ПАНФІЛЮК

„Наша бяспечнасць”

15 мая вучні пятых класаў пачатковых школ змагаліся ў Гайнаўцы на Павятовых спаборніцтвах XIII Конкурсу ім. Браяна Хлябоўскага „Наша бяспечнасць 2009”. Мэтай конкурсу была падрыхтоўка дзяцей

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

да бяспечнага і разважлівага адпачынку ў час канікулаў. Восем каманд з трох асоб рашала тэст, які тычыўся крымінальнай праблематыкі, бяспечнасці на вадзе і ў дарожным руху, нясення першай дапамогі, супрацьпажарнай аховы і аховы асяроддзя. Перамагла каманда з Нараўкі і яна будзе прадстаўляць Гайнаўшчыну на Ваяводскіх спаборніцтвах у Беластоку. Другое месца заваявала каманда з Чыжоў, а трэцяе з Дубін. Кожны з удзельнікаў атрымаў падарунак.

(ус)

Фальшыўкі

Пад такім загалоўкам у 18 нумары „Нівы” ад 2001 г. друкаваўся мой допіс. Перасцерагаў я тады перад купляй тавараў на рынку ад „рускіх”, бо ў большасці выпадкаў былі гэта фальшыўкі. Хоць з таго часу мінула больш сямі гадоў, але гандаль фальшыўкамі на нашых рынках працвітае. Месца несумленных купцоў з-за ўсходняй мяжы занялі айчынныя прайдзісветы, якія дзеля прыбытку намагаюцца абмануць нас.

7 мая перад абедам паліцэйскія Гайнаўскай камендатуры затрымалі жанчыну, якая з аўтамабіля рэкамендавала прахожым фальшыўкі вядомых фірмаў. Функцыянеры правапарадку забяспечылі спартыўныя кашулькі і касцюмы на суму каля трох тысяч злотых. Неўзабаве парушальніца закону будзе прыцягнена да судовай адказнасці.

(ус)

Адгаданка

1. падабенства паміж прадметамі, з’явамі, паняццямі, 2. хітрун, махляр, 3. частка конскай вупражы з сагнутага тонкага ствала дрэва, якая змацоўвае аглоблі з хамутом, 4. харчовы тлушч, які атрымліваецца змешваннем раслінных тлушчаў з жывёльнымі, 5. свабода, 6. квадратны корань з чатырох, 7. маскоўскі ўладар, 8. разлад эканамічнага жыцця, 9. левы або правы ў вусатага, 10. еўрапейская валюта, 11. аптычная ілюзія на гарызонце, 12. левы прыток Прыпяці, які ўліваецца ніжэй Пінска, 13. напрыклад, марафон, 14. прадметы малой велічыні, без істотнага значэння, 15. сталіца Башкірыі.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — румынская пагаворка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

						1			2				3	
	4						5		6					
		7			8	9					10			
							11				12	13		
			14				15							

Адказ на адгаданку з 16 нумара

Буй, вуха, выбары, Іўе, лаўсан, лён, мазь, Пціч, рыза, шок.

Рашэнне: **Кінь шчасліўца ў мора, а ён выплыве з рыбай у зубах.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Разборка з бярозавым калом у доме старцаў

Сліва ля пансіяната — галоўная пацярпелая

Фота і тэкст Евы СЦЕПАНЮК

— І цяпер выглядае, што гэта я наскандаліла, — абураецца бландзінка ў ружовым шведрыку. — Бо маё імя — Галена! Што цяпер сямейка пра мяне падумае? Такі сорам, такая кампраметацыя...

Не адна пані Галенка лічыць сябе пакрыўджанай. Як паказалася ў час гутарак, усе жыхары пансіяната для састарэлых у Старыне (уключна з абслугай), лічаць сябе пакрыўджанымі. А ўжо найбольш сам абвінавачаны ў злачынстве Адам А.:

— Як прачытаў, што напісалі пра мяне ў адной варшаўскай штодзёнцы, то ўсю ноч не спаў, — кажа ўсхваляваны. Ад таго ўсяго, карацей, ад дурной славы, пан Адам хоча знікнуць:

— Спакую манаткі і з'еду з гэтай глушы ў Варшаву... І хай сабе кіснуць тут без мяне!

Падляшша зноў на міг стала слаўнае з-за дурнога.

На Юр'е Беласточчыну абляцеў скандальны ньюс пра бойку ў доме для састарэлых у Старыне Гайнаўскага павета. Як паказалі доследы паліцыі, канфлікт узнік з-за жанчыны. Адам А. разануў бярозавым калом у Казіміра Б., які ад удару трапіў у шпіталь з паламанымі рабрынамі. Пра бойку пісала сталічная бульварная прэса, лакальныя штодзённікі, трубіла радыё. Адны параўноўвалі яе з мардабоем у пячоры, іншыя з Траянскай вайной, якая, як вядома, успыхла з-за прыгожай Галены...

* * *

У асяродку прывіталі нас з варожасцю і пачуццём крыўды. З другога боку адчувалася патрэба канфрантацыі, найперш каб высветліць раздзьмуханыя грубымі вуснамі чуткі. Калі мы пераконвалі абслугу, што прыбываем з добрымі намерамі, побач прайшоўся мужчына ў піжаме. Пасля з'явілася панечка ў ружовым шведрыку. Мы яшчэ не ведалі, што насустрач нам выйшлі галоўныя героі здарэння: пан Адам і пані Галенка. Трэці ўдзельнік здарэння Казімеж Б. зачыніўся ў пакоі і не жадаў нікога бачыць. У шпіталі трымалі яго толькі адзін дзень.

Мы настойвалі. Здаецца, дапамагло магічнае слова „Ніва".

— No dobrze! — адказала сімпатычна пані Эля. А для старэч, якія дапытваліся пра нашу газету, яна адказала: „To taka nasza lokalna gazeta". Спачатку мы трапілі да дзевяностачатырохгадовай пані Зосі, пенсіянеркі-чыгуначніцы. Бабуля прадэкламавала нам два польскія патрыятычныя вершы, праверыла ці ведаем хто аўтар вершыка: „Kto ty jesteś — Polak mały...", распавяла пра свайго прадзеда-паўстанца, які дзесьці тут у лясах змагаўся ў паўстанні 1863 года.

— Moja miłość to historia i geografia, — наставіла нашы мазгі на адпаведныя рэйкі былая чыгуначніца. Таму пасля патрыятычнага ўрока гісторыі мы пацягнуліся з ёй думкамі на Палессе, дзе наша субяседніца ў міжваенны час замацоўвала пальшчызну. Сама яна родам з падваршаўскай Гуры Кальварыі. У Старыну, як большасць жыхароў пансіяната, трапіла з-за „рамонту". Карацей, іх гуртом перасялілі з пансіяната для пенсіянераў-чыгуначнікаў у Мілянуўку. Сказалі пачакаць шэсць месяцаў, да завяршэння рамонту. З часу перасялення мінулі ўжо два гады, а пра вяртанне няма гутаркі. Пані Зося дваццаць два гады пражыла ў Мілянуўку і вельмі хацелася б ёй вярнуцца на абжытае месца.

— Чаму яны нас тут трымаюць?

Мы не ведалі, што адказаць, хоць зрозумелі, што трапілі на тэму-„міну". Пасля клапатлівай хвіліны маўчання пані Зося сама адказала па пастаўленае ў пачатку пытанне пра каханне: „Я не эксперт па каханні. Тыя, якія мне падабаліся, мяне не хацелі, а тыя, што мяне хацелі, мне не падабаліся".

* * *

— Тут чалавек лічыць сябе літаральна „скончаным"! — наракае на дом для састарэлых у Старыне Адам А., абвінавачаны ў пашкоджанні здароўя Казімежа. Ягоны, абвешаны спартыўнымі рэквізітамі і вырэзанымі з часопісаў дзяўчаткамі ў бікіні, пакойчык наўсцяж быў адкрыты, таму мы самі, без дазволу абслугі, запрасіліся ў госці. Мужчына быў рады сустрэчы. Праўда, спачатку ён стаў наракаць на журналістаў, якія зрабілі яго бандытам і донжуанам.

— А я ж ім іншае гаварыў!

Сапраўды, калі б паслухаць толькі аднаго Адама А., уся гісторыя з бярозавым калом перакуліцца дагары нагамі, а ён сам будзе выглядаць як першая і апошняя ахвяра:

— Нервы пусцілі, — кажа пра прычыну бойкі. — Ён мяне ўсё зачапляў. То штурхне, то за рукаў тузане... Раз нават шыны ў ровары парэзаў...

Адам А. — галоўны абвінавачаны

— Без ніякай прычыны? — цягнулі мы. Нам хацелася даведацца пра каханне. Але наш субяседнік стаў гаварыць пра нянавісць між падапечнымі. Асабліва між гарадскімі і жыхарамі пэгеэраў... Бо ў Старыне апрача чыгуначнікаў з Мілянуўка пасялілі яшчэ старэч з пэгеэраў ад Ольштына і Сямятыч. Апошнія не выклікаюць зацікаўлення ў першых, хіба што ідзе пра адмоўныя эмоцыі. І таму Адам А. лічыць недарэчнасцю, каб яго лічылі сапернікам нейкага Казімежа з раскінутага пэгеэра.

— Я ж не малойчык, каб за кабет дзерціся, — кажа з нейкай тэатральнасцю. — Нам ужо за семдзесят...

— У кожным узросце чалавек патрабуе кахання, сяброўства, цеплыні, — не пагадзіліся мы. Адам А. паказаўся нам вулканам энергіі. Асабліва калі параўнаць яго да апошніх жыхароў пансіяната.

— Маё каханне гэта спорт! — пачулі ўжо вядомы адказ. Пасля наш субяседнік расказаў пра веласіпедныя вандроўкі па пушчы. Раз нават памежнікі ля мяжы завярнулі яго, каб у Беларусь не ўцёк.

* * *

Са Старыны немагчыма выбрацца на публічным транспарце. Аўтобус чамусьці канчае маршрут у суседняй, аддаленай у чатыры кіламетры Войнаўцы. Быццам спецыяльна, каб падапечныя з пансіяната не далі драла.

— Тут нават бібліятэкі няма, — наракае Адам А. — Маразм, што хоць ты ў пушчу ідзі і з ваўкамі завывай. Ніхто з нікім не сустракаецца, не дапамагае. Нават калі святло адключылі, я адзін пратэставаў. За тое яшчэ больш мяне зненавідзелі...

Сапраўды, эмацыйны кошт выжывання ў доме для састарэлых у Старыне страшны. Адсюль складана пазваніць сям'і і расказаць пра сваё гора. У будынку, аколеным пушчай, пяцьсот метраў ад мяжы з Беларуссю, не заўсёды спрацоўвае тэлефонная сувязь. Каб злавіць мабільны абсяг, трэба таптацца туды-сюды. Апошні клопат датычыць усіх жыхароў Старыны. Хоць больш чым на камунікацыю мясцовыя наракаюць на дзікоў, якія падходзяць пад хаты і рыюць агароды, бульбу.

* * *

— А вам гэта смешна, што старыя кахаюць адзін аднаго? — спытала нас цётка на інваліднай калясцы.

— Не, гэта не так! — адказалі мы шчыра. Бо праўда такая. Нам было сорам з-за дурной цікаўнасці. Асабліва, калі нам сказалі пра псіхічны стан здароўя Казімежа Б. Няшчасны не кантралюе сваіх эмоцый. Спачатку вырубаў сліўку-дзічку ля пансіяната (якую многія любілі, бо са слівак варылі сочыва), а пасля задумаў спаліць стары крыж каля магазіна ў Старыне.

— А чаму?

— А таму, каб стары пень не тырчэў сярод вёскі! — меў сказаць жыхарам Старыны пацярпелы ў бойцы Казімеж Б.

Пра раманы ў доме для састарэлых тут апавядаюць з адабрэннем і пушчанскім гумарам.

— Няхай бы хоць хто ажаніўся з іх, — кажа Галіна Богунь, солтыс Старыны. — То і нам весялей было б. А то адны мярліны за мярлінамі...

24.05 — 30.05

(22.03. — 20.04.) Не будзеш баяцца цяжкіх выклікаў. Апошні тыдзень гэтага мая аж кіпіць ад поспехаў! 25-29.05. навучышся перамагаць, прымяняючы пакорлівасць і пачуццёвасць, спалучаныя з непахіснай самаўпэўненасцю. Справішся з перакананнем іншых да тваіх ідэй. Да 26.05. цяжкі выбар паміж сваімі інтарэсамі і патрэбамі найбліжэйшых.

(21.04. — 21.05.) 23-27.05. выкарыстай да інвеставання — маеш добры нюх да фінансаў і інтарэсаў. Можаш спадзявацца павышэння. Стартуй з новымі ідэямі і задумамі.

(22.05. — 22.06.) Прыйдуць у галаву табе фантастычныя ідэі, развяжаш самыя складаныя праблемы. У кампаніі будзеш ззяць і захапляць усіх сваёй інтэлігентнасцю. Канцэнтруйся таксама на сваім здароўі і добрым настроі.

(23.06. — 23.07.) 24 мая, пры маладзіку Месяца, можаш адчуваць сябе ненайлепш. Прытармазі тэмп, услухайся ў сваё цела. Не прымушай сябе да высілку. Займіся тым, што найбольш любіш.

(24.07. — 23.08.) Справішся з усім, у чым паможа табе Меркурый. Змарнуй крыху часу з сябрамі. Пабудзь на прыродзе, падлячыся натуральнымі прэпаратамі. Заімпануе табе хтосьці радасны, рамантычны і ўдухоўлены.

(24.08. — 23.09.) Звернуць на цябе ўвагу асабліва цікавыя і ўплывовыя людзі. Увядуць яны цябе ў зусім іншы свет. Жыццё стане цікавейшым. Затое пакантралюй вагу і зрабі неабходныя даследаванні ў лекара.

(24.09. — 23.10.) Адкрыюцца перад табой новыя магчымасці, будуць вельмі прыемныя падарожжы. Добры час на навуку і набыванне новых умеласцей. Самотныя Шалі пазнаёмяцца з кімсьці вельмі цікавым. Добры час пахудзець.

(24.10. — 22.11.) Дзейнічай адважна, а нават бравурна! Можаш рызыкнуць, бо можаш шмат здабыць. Вельмі спорна пойдзе ў інтарэсах. Пафліртуй у інтэрнэце. Наконт здароўя — калі паявяцца падазроныя прыкметы, бяжы да доктара.

(23.11. — 22.12.) Лёгка ажыццявіш усе праекты, нават зусім шалёныя. Асабліва, калі працуеш на сваім — маеш гарантаваны рух у інтарэсе (найлепшы метад — малыя крокі). Затое крыху слабей са здароўем і настроем.

(23.12. — 20.01.) Набярэш імпэту ў дзеяннях. Добры нюх да карысных інтарэсаў. Крышку ідэалізму не пашкодзіць, але не будзь зашчодры! Паміж табою і сябрамі можа дайсці да невялікіх скрыгітаў. Пані Казярогі, не плануючыя дзяцей — забяспечцеся!

(21.01. — 19.02.) Вызваліцца ў табе вялікая энергія. Адкрыешся на новыя магчымасці, дзякуючы аптымізму аздаровіш сваё жыццё. Кіруйся аптымізмам. Лепш у фінансах. 26-30.05. можаш адчуць расчараванне — тое, што нядаўна было ў межах тваіх магчымасцей, можа аддаліцца.

(20.02. — 21.03.) Вельмі пашчасціцца табе ў фінансах. Будзеш дзейнічаць з поспехам і эфектыўна, здабудзеш сімпатыю атачэння. Дасі рады з рамонтам кухні ці лазенькі. Рыбы з 16-19.03. — будзьце асцярожныя, асабліва са сваімі ныркамі!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960